

**Яўгенія Янішчыц: талент нёс яе на крылах**

СТАР. 3



**Катаракта: мутны хрусталік трэба мяняць**

СТАР. 4



**Замуж па разліку? Можна і пралічыцца**

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 ЛІСТАПАДА 2013 г. СУБОТА № 221 (27586) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Парламенцкі дзённік

## АБ'ЯДНАЦЬ БЕЛАРУСАЎ СВЕТУ

**Учора адбылося чарговае пасяджэнне трэцяй сесіі Палаты прадстаўнікоў пятага склікання, на якім дэпутаты разгледзелі адзінаццаць законапраектаў. Абмяркоўваліся праекты законаў «Аб беларусах замежжа», «Аб унясенні змен і дапаўненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях», «Аб супрацьдзеянні манапалістычнай дзейнасці і развіцці канкурэнцыі» і іншыя. Таксама вылучаўся блок законапраектаў, якія датычыліся ратыфікацыі дагавораў з іншымі дзяржавамі: Лаосам, Бангладэш, Узбекістанам, ААЭ.**

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў вельмі актыўна абмяркоўвалі праект Закона «Аб беларусах замежжа», які прадстаўляла **Алена КУПЧЫНА, намеснік міністра замежных спраў.** Па яе словах, праца над законапраектам ішла не адзін год. Абмеркаванне канцэпцыі будучага закона праходзіла з удзелам найбольш уплывовых арганізацый, якія аб'ядноўваюць беларускія дыяспары. Таксама прыняцця закона вельмі жадалі ўдзельнікі апошняга з'езда беларусаў свету «Бацькаўшчына».

— Беларусь зацікаўлена ў развіцці адносін з тымі людзьмі, якія памятаюць сваю гістарычную радзіму, — сказала Алена Купчына. — Нашы суайчыннікі ў замежжы — добры рэсурс для прасоўвання іміджу краіны за мяжой. Закон у любым выпадку стане вялікім крокам наперад, які прадэманструе, што дзяржава не адварочваецца ад беларусаў, якія знаходзяцца па-за межамі краіны. Законапраект закладвае першапачатковую сістэму, якую можна будзе карэктаваць у будучыні.

Па розных ацэнках за мяжой жыве 2-3,5 мільёна беларусаў. (Міністэрства замежных спраў называе лічбу ў 1,5 мільёна). Па ўсім свеце раскідана шмат буйных беларускіх суполак.

Існуючае рэгуляванне, па меркаванні Алены Купчынай, характарызуецца пэўнымі недахопамі: адсутнасцю адзіных падыходаў у розных актах, рознай тэрміналогіяй, адсутнасцю адзінага дзяржаўнага органа, які быў бы адказны за правядзенне агульнай палітыкі ў дачыненні да беларусаў замежжа, нявызначанасцю катэгорыі асоб, якія лічацца «беларусамі замежжа». У законапраекце прапануецца ліквідаваць гэтыя недахопы. Адзіным органам па справах беларускіх дыяспар будзе прызначана Міністэрства замежных спраў. Статус «беларусаў замежжа» атрымаюць грамадзяне РБ, што жывуць за мяжой, замежныя грамадзяне, чые прамыя продкі пражывалі на тэрыторыі Беларусі, а таксама замежныя грамадзяне, якія ідэнтыфікуюць сябе з Беларуссю, яе культурай, гісторыяй і традыцыямі.

**Дэпутат Валянціна ВЕРАС** запыталася пра наступствы, якія будучы закон можа прынесці дзяржаўнаму бюджэту. Намеснік міністра адказала, што зараз ніякіх выдаткаў на патрабуецца. Магчыма, пры аналізе першых вынікаў дзейнасці гэтага закона пытанне аб фінансавых выдатках будзе перагледжана. Законапраект быў прыняты дэпутатамі ў першым чытанні.

Праект Закона РБ «Аб супрацьдзеянні манапалістычнай дзейнасці і развіцці канкурэнцыі» для журналістаў пракаментаваў **старшыня Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК:**

— Законапраект будзе карэктаваць існуючыя нормы з улікам практыкі ў нашай краіне. Акрамя таго, ён прыводзіцца ў адпаведнасць з ужо падпісанымі Беларуссю дагаворамі ў межах Адзінай эканамічнай прасторы. Законапраект вызначае некаторыя новыя паняцці. Гэта значыць, што сфера яго ўжывання будзе вельмі высокай. Больш самастойным будзе і наш антыманапольны орган. Згодна з законапраектам, дзяржаўным установам будзе забаронена любым чынам абмяжоўваць канкурэнцыю і замінаць перамяшчэнню тавараў па рэспубліцы.

У Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях будзе ўведзены артыкул 23.86, які прадугледжвае адказнасць за прадстаўленне ў наём жылля, пабудаванага, рэканструяванага або набытага з дапамогай ільготнага крэдыту, да яго пагашэння.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

## УРАД НАЗВАЎ ГАЛОЎНЫЯ АРЫЕНЦІРЫ НА БУДУЧЫ ГОД

Экспарт, мадэрнізацыя, стварэнне новых вытворчасцяў, развіццё малога бізнесу ў рэгіёнах і прамыя замежныя інвестыцыі

**На сустрэчы з Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь Міхаілам Мясніковічам, кіраўніком Нацыянальнага банка Надзеяй Ермаковай і міністрамі эканомікі і фінансаў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі абмеркавалі праекты прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця, рэспубліканскага бюджэту і асноўных кірункаў грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі на 2014 год. Прадстаўнікі урада запэўнілі дэпутатаў, што пастаўленыя мэты магчымыя для дасягнення, калі яны будуць не мэтамі ўрада, а мэтамі міністраў і кіраўнікоў абласцей.**

СТАР. 2

## КОЛЬКІ ЛІСТОЧКАЎ — СТОЛЬКІ СЫНОЧКАЎ!



Удзельнікі Рэспубліканскага семінара ідэалагічнага актыву на чале з першым намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандрам Радзьковым прысутнічалі на адкрыцці скульптурнай кампазіцыі «Дрэва шчасця» ля будынка ЗАГСа ў Смаргоні.

Фота БЕЛТА.

■ Прамая лінія

# ПЕНСІЯ

## ЗАЛЕЖЫЦЬ У ПЕРШУЮ ЧАРГУ АД СТАЖУ І ІНДЫВІДУАЛЬНАГА КАЭФІЦЫЕНТА ЗАРОБКУ...

**Пытанняў наконт пенсій заўсёды шмат. Таму 19 лістапада Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі разам з газетай «Звязда» правяло прамую тэлефонную лінію, прысвечаную пенсійнаму забеспячэнню. На вашы пытанні адказала начальнік галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Наталля Уладзіміраўна Мурашкевіч.**

### Пенсіі ва ўсіх розныя

...Хутка дзесяць гадзін — пачатак прамой лініі. Наталля Уладзіміраўна кладзе побач з сабой тэкст заканадаўства, службовыя інструкцыі, запасную ручку. Я — блакнот і дыктафон.

***— Добры дзень! Гэта вас Любоў Іванаўна Лаванава з Браслаўскага раёна турбуе. Я жыву ў вёсцы Пузыры. Мой муж — грамадзянін Расіі, атрымлівае пенсію адтуль, адзін раз у квартал. Мы б хацелі атрымліваць яе штомесяц. Ці можна так?***

— Прызначэнне і выплата пенсій грамадзянам Расіі, якія пражываюць у Беларусі, рэгулюецца пагадненнем (дагаворам) у галіне сацыяльнага забеспячэння, заключаным паміж Расійскай Федэрацыяй і Беларуссю, — тлумачыць Наталля Уладзіміраўна. — Згодна з гэтым пагадненнем, выплата пенсій з Расіі ў Беларусь (і наадварот) ажыццяўляецца штоквартальна ў апошнім месяцы квартала. Ніякіх змяненняў у перыядычнасці гэтых выплат не чакаецца.

***— Зразумела. Дзякуй!***

**Васіль Пятровіч Губарэвіч з Бабруйска, які патэлефанаваў наступным, аказаўся незадаволеным памерам сваёй пенсіі:**

***— У мяне працоўны стаж — 43 гады, індывідуальны каэфіцыент — 2,0. Летась пайшоў на пенсію. Мне налічылі маленькую суму! Я лічу, што пенсія павінна быць не менш за 4 млн рублёў, інакш немагчыма пражыць!***

— Вы атрымалі такую пенсію, якую павінны былі атрымаць, — адказвае Наталля Мурашкевіч. — Цяпер працуеце?

***— Так.***

— Тады вам пенсія выплачваецца з індывідуальнага каэфіцыента заробку 1,3. Калі вы пакінеце працу, ваша пенсія будзе вылічвацца, зыходзячы з індывідуальнага каэфіцыента заробку 2,0.

***— Я ўсё жыццё працаваў, а цяпер атрымліваецца, што ў мяне і ў таго, хто не працаваў, аднолькавыя пенсіі...***

— Гэта не зусім так. Пенсіі ўсе атрымліваюць розныя. Ёсць мінімальная пенсія, якая сёння складае 1 206 650 рублёў. Яна прызначаецца пры стажы 20 гадоў (у жанчын) і 25 гадоў (у мужчын). Максімальная пенсія — 3.489.000 рублёў. Яе атрымліваюць тыя, у каго 40/45 гадоў (у жанчын і мужчын) стажу і індывідуальны каэфіцыент заробку — 4 і вышэй.

***— Але ў мяне ўжо стаж 46 гадоў, таму што пасля прызначэння пенсіі я працую... — не здаецца Васіль Пятровіч.***

— Але вы ўжо атрымліваеце пенсію, — цярпліва тлумачыць Наталля Уладзіміраўна. — Ваш стаж можа быць павялічаны толькі ў тым выпадку, калі вы не будзеце атрымліваць пенсію ў перыяд работы. У вас ёсць магчымасць адмовіцца ад пенсіі, пакуль вы працуеце, і потым атрымаць прэмію да пенсіі, гэта значыць павялічыць яе.

***— Я не хачу адмаўляцца ад пенсіі.***

— Гэта ваша права...

**75-гадовая працуючая пенсіянерка Галіна Фёдараўна Ланеўская з г.п. Плешчаніцы пацікавілася:**

***— Калі я пакіну працу, ці будзе мне павялічана пенсія? Я ўвесь час, калі працавала, плаціла ўнёскі...***

— Не, не будзе. Справа ў тым, што гэтыя пенсійныя ўзносы ў памеры 1%, якія вы выплачваеце ў Фонд сацыяльнай абароны, ідуць на выплату бальнічных лістоў, дзіцячых дапамог і г.д. А пераразлік пенсіі магчымы толькі ў тым выпадку, калі працуючы пенсіянер яе не атрымлівае. Але, калі вы пакінеце працу, вам пачнуць выплачваць узроставы бонус да пенсіі — з месяца, наступнага за тым, у якім вы звольніцеся. Памер гэтага бонусу для 75-гадовага пенсіянера сёння — 196 тыс. рублёў.

***— Дзякуй!***

*Тэлефон звоніць амаль не змаўкаючы. Варта толькі пакласці трубку — тут жа наступны званок.*

***— Мяне завуць Антаніна Ільінічна Піменава, я з Мінска, — чуваць у трубцы бадзёры голас. — Ці можна задаць пытанне? Калі, у які месяц пачынаюць даплачваць дадатак да пенсіі пры спаўненні 75 гадоў?***

— Сапраўды, 75-гадовым грамадзянам, якія атрымліваюць пенсію ад органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, калі яны не працуюць і пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, устаноўлена ўзроставая даплата. Яна выплачваецца з месяца, наступнага за дасягненнем 75 гадоў, або звальнення пенсіянера. Выплачваецца гэтая даплата разам з пенсіяй (уключана ў памер пенсіі), штомесяц. Калі вам спаўняецца 75 гадоў у лістападзе, гэтую дабаўку вы пачняце атрымліваць са снежня.

***— Дзякуй!***

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль РУБІНАЎ, Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі:**

***Эканамічны вопыт краін ЕС не можа быць слепа скапіраваны для Беларусі. У свеце склалася няпростая сітуацыя. Гэта звязана са з'яўленнем новых гульцоў на геапалітычнай прасторы, перадзелам рынкаў, узмацненнем канкурэнцыі паміж асобнымі вытворцамі, краінамі і цэлымі эканамічнымі блокамі. Цяпер ёсць такая тэндэнцыя — капіраваць. Дык вось нам такія прыклады капіраваць не трэба. Беларусь павінна арыентавацца на ўласны вопыт. Мы не можам перанесці тое, што там ёсць, да нас. У нас іншыя асновы, іншая гісторыя, іншая псіхалогія, свае традыцыі.***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.11.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9300,00 | ▲ |
| Еўра | 12540,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 282,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1131,39 | ▲ |

■ Курсавая розніца

### Няма інфляцыі — няма развіцця?

**Спыненне інфляцыі ў еўразоне працягвае ствараць праблемы для еўрапейскай эканомікі. Людзі чакаюць, што цэны на тавары зніззяцца яшчэ больш, а таму попыту з боку насельніцтва амаль няма. Вынік — у прамысловасці няма збыту.**

Змен у сітуацыі пакуль не прадбачыцца. Еўрапейскі Цэнтрабанк ужо нават дае зразумець, што стаўкі па дэпазітах будуць набываць адмоўныя значэнні. Асабліва незадаволены гэтым будуць жыхары Германіі, якія трымаюць значную частку сваіх зберажэнняў на дэпазітах. У выніку еўра здае свае пазіцыі ў адносінах да іншых сусветных валют.

У нашай краіне сітуацыя трохі іншая. І еўра, і долар за гэты тыдзень выраслі. Першы — на 170 рублёў (плюс 1,4%) да 12540, другі — на 30 рублёў (плюс 0,3%) да 9300. Расійскі рубель, які ўжо тры тыдні падае, патаннеў яшчэ на 1 грашовую адзінку (мінус 0,4%) да 282,5.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У МАЛДОВЕ СУАДНОСІНЫ ПРЫХІЛЬНІКАЎ УСТУПЛЕННЯ Ў МЫТНЫ І ЕЎРАСАЮЗ ПРЫКЛАДНА РОЎНЫЯ

Так, паводле вынікаў даследавання грамадскай думкі, праведзенага Цэнтрам сацыялагічных даследаванняў і маркетынгу CBS — AXA, калі б у наступную нядзелю ў Малдове адбыўся рэферэндум па пытанні ўступлення ў Мытны саюз або Еўрасаюз, то за далучэнне краіны да МС прагаласавала б 43% апытаных, а за далучэнне да ЕС — 44,7% рэспандэнтаў.

### КАВА З КАФЕІНАМ ДАПАМАГАЕ САСУДАМ ПРАЦАВАЦЬ ЭФЕКТЫЎНА



Кардыёлагі зрабілі нечаканую выснову: кафеін можа палепшыць прыток крыві, піша The Times of India. Даследаванне 27 здаровых чалавек упершыню паказала, што кубак кавы з кафеінам значна ўзмацняе крывацёк у пальцах. Гэта дазваляе ацаніць, наколькі добра працуе ўнутранае высцілянне дробных сасудаў. Так, пасля кубка кавы ў людзей на 30% паляпшаўся прыток крыві на працягу наступных 75 хвілін. Кава без кафеіну не працавала. Па словах кіраўніка пошуку Масата Цуцуі з японскага Універсітэта Рукю, у даследаванні ўдзельнічалі людзі, якія спажывалі каву нерэгулярна. Усім ім было ад 22 да 30 гадоў. У параўнанні з кавай без кафеіну кафеін трохі павышаў ціск, але затое паляпшаў працу высцілання сасудаў. Сэрцабіцце было аднолькавым і не залежала ад тыпу спажытай кавы.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### У ЛАТВІІ АБВЕШЧАНА ТРОХДЗЁННАЯ ЖАЛОБА



Колькасць загінулых пры абрушэнні супермаркета Maxima, размешчанага ў адным са спальных мікрараёнаў Рыгі, дасягнула 40 чалавек. «Нагадваем, што афіцыйных спісаў няма. Тое, што вы, верагодна, ужо бачылі ў сацсетках, можа аказацца недакладнай інфармацыяй», — дадаюць журналісты выдання. Пад заваламі могуць знаходзіцца яшчэ 25 чалавек, перадае ІТАР — ТАСС словы мэра Рыгі Ніла Ушакова. Паводле яго звестак, колькасць ахвяр здарэння дасягнула 38 чалавек. Раней стала вядома, што як мінімум тры ахвяры трагедыі — ратавальнікі.

Напярэдадні каля 19:00 спачатку абрынуліся адна са сцен будынка і дах. Пазней, калі тэрыторыю пачалі вызваляць ад завалаў, павалілася яшчэ адна сцяна. Плошча абрушэння склала каля 500 кв. метраў. У выніку здарэння ў гарадскія бальніцы былі дастаўлены 28 пацярпелых. Астатнія ад шпіталізацыі адмовіліся і атрымалі першую медыцынскую дапамогу на месцы здарэння. Паводле паведамлення Латвійскага інфармацыйнага агенцтва LETA, прычынай таго, што адбылося, маглі стаць работы па азеляненні даху гандлёвага цэнтра. Як паведаміў мясцовай радыёстанцыі Baltkom адзін з рабочых, на даху супермаркета размясцілі не менш за 48 тон будматэрыялаў. Як паведамляе шэраг мясцовых СМІ, Айнарс Паўніньш, саўладальнік будаўнічай кампаніі, якая праводзіла работы, трапіў у бальніцу з сардэчным прыступам. Тым часам у Латвіі абвешчана трохдзённая жалоба. Ахвяр пры абрушэнні гандлёвага цэнтра магло быць значна менш, але кіраўніцтва супермаркета не арганізавала своечасовую эвакуацыю, паведамляе РБК са спасылкай на кіраўніка дзяржаўнай паліцыі Латвіі Інтса Кузіса.

***Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў шчырыя спачуванні прэзідэнту Латвійскай Рэспублікі Андрысу Берзіньшу, а таксама родным і блізкім загінулых у выніку абрушэння даху ў рыжскім гандлёвым цэнтры, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. У спачуванні гаворыцца, што ў Беларусі з глыбокім болем і сумам успрынялі паведамленне аб шматлікіх чалавечых ахвярах у выніку трагедыі, якая здарылася.***

КОРАТКА

Аклады работнікаў (спартсменаў-інструктараў і трэнерскага складу) нацыянальных камандаў Беларусі па розных відах спорту ў сярэднім будуць павялічаны на 85 працэнтаў.

Уладзіслаў Баўмгертнер 21 лістапада быў перададзены прадстаўнікам расійскіх праваахоўных органаў.

Беларуска Наталля Трафімава заняла трэцяе месца на міжнародным конкурсе прыгажосці «Місіс Еўропа-2013», які завяршыўся ў Адэсе. Тытул і карона пераможцы дасталіся расіянцы, другое месца ў дзяўчыны з Аўстрыі.

Напярэдадні выхадных ДАІ заклікала вадзіцеляў праяўляць на дарозе асаблівую асцярожнасць і быць вельмі ўважлівымі ў сувязі з неспрыяльнымі ўмовамі надвор'я.

У кожным трэцім правераным магазіне сеткі «Еўраопт» (ТАА «Еўрагандаль») рэалізоўваўся пратэрмінаваны тавар, паведамілі ва ўпраўленні кантролю спажывецкага рынку — Гандлёвай інспекцыі Міністэрства гандлю.

## УБАЧЫЦЬ, ПАЧУЦЬ І ЗАПОМНІЦЬ НАЗАЎЖДЫ

**Яшчэ гадоў дзесяць таму падобнае ўявіць было немагчыма, аднак тое, што здарылася, — факт, які, мяркую, на ўсё жыццё запомніцца маленькім удзельнікам мерапрыемства. Аляксандр Карэлін, трохразовы алімпійскі чэмпіён па грэка-рымскай барацьбе, сустрэўся ў Бярозе з мясцовымі барцамі, большасць з якіх робіць толькі першыя крокі ў любімым відзе спорту.**

Усе месцы ў вялікай, сучаснай барцоўскай зале, што на другім паверсе мясцовага Лядовага палаца, занятыя. Дзеці моўчкі, з цікаўнасцю пазіраюць на вялікага чалавека ў чорнай майцы і шортах, які так нечакана матэрыялізаваўся з газетных фотаздымкаў, гісторый, што з захапленнем распавядалі пра яго трэнеры і бацькі. І самае галоўнае, гэты асілак не такі суворы, як падавалася на карцінках. Ён любіць жартаваць, задаваць пытанні, узгадваць карысныя гісторыі і пэўныя афарызмы, чым у чарговы раз разбівае дылетанцкі стэрэатып пра недалёкасць спартсменаў. Вялікія людзі і сапраўды вялікія ва ўсім. Не можа ўтаіць сваё захапленне Карэлінам і Алім Селімаў, наш двухразовы чэмпіён свету па грэка-рымскай барацьбе. «Упершыню я ўбачыў яго па тэлевізары, калі свядома пачаў разумець барацьбу. Гэта была Алімпіяда ў Атланце ў 1996 годзе, — прыгадвае Алім. — Глядзеў на яго і думаў, які ён вялікі! Чалавек-гара! Аляксандр Карэлін — выдатная асоба. І падобныя сустрэчы сталі б добрым крокам да папулярызацыі барацьбы ў нашай краіне. У Беларусі ёсць пераможцы і прызёры буйных спаборніцтваў, якія таксама маглі б перадаць свой досвед дзецям».



У падарунак дзеці атрымалі кнігі пра легендарнага барца Івана Паддубнага

Дарэчы, што тычыцца Бярозы, секцыя грэка-рымскай і вольнай барацьбы пры мясцовай ДЮСШ працуе чатыры гады. Займаюцца ў ім пад кіраўніцтвам двух трэнераў 84 юныя спартсмены. «Добра, што ў такіх невялічкіх гарадах, як Бяроза, дзякуючы Юрыю Чыжу, старшыні федэрацыі барацьбы, створаны добрыя ўмовы для падрыхтоўкі, — працягвае Алім. — Брэсцкі рэгіён у барацьбе раней крыху адставаў ад іншых».

СТАР. 2

# ЖЫЦЦЁ НА МЕСЦЫ НЕ СТАІЦЬ

## Адказныя задачы ідэалагічнага актыву

**Роля ідэалагічнага актыву, структур палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў, СМІ ў вырашэнні сацыяльна значных праблем насельніцтва — гэтыя пытанні былі абмеркаваны ўчора ў Смаргоні на семінары ідэалагічнага актыву Гродзеншчыны з удзелам першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Радзькова.**



Фота БЕЛТА.

У семінары ўдзельнічалі намеснікі старшыняў аблвыканкамаў, якія курыруюць пытанні ідэалагічнай работы, начальнікі галоўных упраўленняў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкамаў, актывісты грамадскіх аб'яднанняў «Белая Русь» і БРСМ, галоўныя рэдактары СМІ вобласці і іншыя.

Семінар распачаўся адкрыццём на пляцоўцы каля будынка ЗАГСа скульптурнай кампазіцыі «Дрэва шчасця», а затым удзельнікі наведалі шэраг арганізацый Смаргоні — замежнае прадпрыемства «Кронаспан», ААТ «Смаргонскія малочныя прадукты», краязнаўчы музей, сярэднюю школу № 7. У ЗАГСе быў наладжаны марафон сацыяльна значных ініцыятыў. Сярод іх — праекты «Лепшая творчая сям'я», «Жывая гісторыя», «Моладзевы беларуска-расійскі студэнцкі атрад на аб'ектах інфраструктуры АЭС у Астраўцы», «Сто ідэй для Беларусі», дабрачынная акцыя «Анёл у тваім сэрцы».

Аляксандр Радзькоў адзначыў, што ідэалагічная работа павінна ажыццяўляцца своечасова і сістэмна, а ідэалагічныя работнікі — заўсёды знаходзіцца на хвалі падзей, таму што жыццё не стаіць на месцы, яно пастаянна ўносіць свае карэктывы ў любыя планы.

— Мы жывём у суверэннай дзяржаве і, зразумела, павінны ведаць, якое грамадства і якую эканоміку мы фарміруем, усведамляць характар сваёй нацыянальнай ідэі. Напрыклад, сёння мы пабывалі на дрэваапрацоўчым прадпрыемстве. Там — усё наша, айчынныя сыравіна і матэрыялы, там працуюць добра падрыхтаваныя сучасныя спецыялісты. На такія вынікі і павінна быць накіравана ідэалагічная работа, — сказаў ён.

На пленарным пасяджэнні было прыведзена шмат прыкладаў эфектыўнай ідэалагічнай работы. У прыватнасці, намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Ігар Жук назваў выпадак, калі ідэолагі, убачыўшы падчас маніторынгу напружанне ў адным з працоўных калектываў, парэкамендавалі губернатару сустрэцца з людзьмі. Што і было зроблена. У выніку прадпрыемства сёння нармальна працуе, яно было знята з продажу на аўкцыёне.

Акрамя таго, своечасовае ўмяшанне ідэалагічных работнікаў папярэдзіла спробу рэйдарскага захопу аднаго з масласырзаводаў вобласці.

Аляксандр Радзькоў звярнуў увагу на актуальныя пытанні сённяшняй ідэалагічнай работы. Поруч са своечасовасцю, комплекснасцю і сістэмнасцю важна ўлічваць пачуццё меры, якое павінна адпавядаць існуючым рэаліям і задачам. Пільнай увагі патрабуюць таксама пытанні прафесійнай арыентацыі моладзі, укаранення перадавых тэхналогій, што робіць прэстыжнай працу для маладых спецыялістаў.

Сустрэча ідэалагічных работнікаў у Смаргоні завяршылася дабрачыннай акцыяй «Грамадскія арганізацыі — дзецям». Каштоўныя падарункі і сувеніры атрымалі лепшыя вучні, настаўнікі, а таксама шматдзетныя сем'і, людзі з абмежаванымі магчымасцямі.

Цікава было пачуць уражанні ўдзельнікаў семінару ў Смаргоні.

**Алена ПАТАПАВА, намеснік кіраўніка па ідэалагічнай рабоце ТАА «ЗОВ», старшыня прафкама:**

— Менавіта па ініцыятыве кіраўніка гродзенскай фірмы «ЗОВ» Уладзіміра Зухавіцкага быў створаны прафсаюзны камітэт, а затым я стала намеснікам кіраўніка прадпрыемства па ідэалагічнай рабоце. Сёння мы сумесна вырашаем важныя для членаў працоўнага калектыву вытворчыя і бытавыя праблемы. І гэтыя клопаты ёсць, на мой погляд, галоўны складнік ідэалагічнай работы.

**Іван ТУСТАЎ, старшыня Гродзенскай абласной ветэранскай арганізацыі:**

— Разам з выканаўчай уладай мы шмат працуем над вырашэннем надзённых сацыяльных пытанняў пажылых людзей, актыўна ўзаемадзейнічаем і з моладдзю. Сёння яшчэ раз упэўніўся ў тым, што мы рухаемся ў правільным кірунку.

**Генадзь БЫЧКО, намеснік старшыні Смаргонскага райвыканкама, старшыня раённай арганізацыі рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь»:**

— Наша арганізацыя з кожным годам становіцца ўсё больш аўтарытэтнай. На яе рахунку шмат добрых і важных спраў. Сённяшняя нарада, мяркую, будзе спрыяць больш зладжанай працы. Ідэалогія для мяне — гэта штодзённае жыццё, самыя будзённыя клопаты, вынікам якіх становіцца пазітыўны настрой людзей.

**Барыс ПРАКОПЧЫК,**

*г. Смаргонь*

# УРАД НАЗВАЎ ГАЛОЎНЫЯ АРЫЕНЦІРЫ НА БУДУЧЫ ГОД

### Прызнанне праблем

Прэм'ер-міністр паведаміў парламентарыяў, што ўрад бачыць праблемы ў эканоміцы краіны. Сярод іх — канкурэнтаздольнасць вытворчасці як на знешніх так і на ўнутраным рынках. Экспарт інвестыцыйных тавараў у краіне скараціўся сёлета на 13%, а спажывецкі імпарт вырас амаль на трацiну.

— Якасных тавараў і паслуг, каб задаволіць попыт нашых людзей, выпрацоўваецца недастаткова, — канстатаваў Міхаіл Мясніковіч. — Тут сур'ёзна недапрацоўваюць і ўрад, і нашы прадпрыемствы. Таму наша задача — глядзець не толькі за цяжкай прамысловасцю, але і за вытворчасцю спажывецкіх тавараў, якіх у нас і недастаткова, і яны невысокай якасці. Таму патрэбна больш новых вытворчасцяў, якія вырабляюць тавары народнага спажывання.

Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што ўрад разлічвае тут на актывізацыю малога і сярэдняга бізнесу.

Другой балючай кропкай эканомікі з'яўляецца недастатковая эфектыўнасць мадэрнізацыі. Тэмпы росту вытворчасці працы па годзе чакаюцца ў памеры 102,7% — паказчык вельмі дрэнны, прызнаў кіраўнік урада, аддача ад інвестыцый слабая. Толькі палова беларускіх прадпрыемстваў з ліку тых, якія адсочвае Міністэрства эканомікі, паспяхова мадэрнізуюцца і гатовы адказваць на выклікі часу.

— Галоўнае тут не асваенне грошай, а эфектыўныя праекты, — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. — Трэба прызнаць, што ў многіх нашых кіраўнікоў не хапае досведу працы ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі. У нас добрыя інжынеры, тэхнолагі, а вось многія арганізатары маркетынгавай дзейнасці нікуды не вартыя. Думаю, што ўжо ў наступным годзе мы запусцім новую праграму падрыхтоўкі кадраў пад умоўнай назвай «Менеджмент 2020» і будзем штогод павышаць патрабаванні да якасці карпаратыўнага кіравання і на дзяржпрадпрыемствах, і ў адпаведных галінах.

### Асноўныя крыніцы росту

Планы 2014 года ўрад фарміраваў як адказы на злабадзённыя пытанні эканамічнага развіцця і мадэрнізацыі краіны, сказаў прэм'ер-міністр. Сярод асноўных крыніц эканамічнага росту ён назваў мадэрнізацыю і структурнае рэфармаванне эканомікі, уключаючы пытанні гарманічнага развіцця прыватнага і дзяржаўнага сектара і стварэнне новых сучасных вытворчасцяў; рост эфектыўнасці знешняй эканамічнай дзейнасці, рэалізацыя экспартаарыентаванай стратэгіі ва ўмовах Адзінай эканамічнай прасторы і Сусветнай гандлёвай арганізацыі.

— Мы плануем выйсці на 111% росту экспарту — гэта дастаткова напружаная задача, і фактычна ўвесь прырост аб'ёмаў вытворчасці павінен пайсці толькі на экспарт. Ніякага ўнутранага рынку, — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Яшчэ адзін кірунак — удасканаленне фінансавай сістэмы, уключаючы праграмна-мэтавы метад рэалізацыі сучаснай прамысловай і сельскагаспадарчай палітыкі. Урад разгледзеў заўвагі Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве аб вялікай колькасці дзяржаўных праграм, пагадзіўся з неабходнасцю аптымізацыі іх колькасці. Разам з тым, кіраўнік урада заўважыў, што ў вялікай колькасці дзяржаўных праграм няма сістэмнай памылкі, бо ў краіне існуе праграмна-мэтавы метад развіцця эканомікі.

Кажучы пра новае ў фінансавых дакументах, якія тычацца будучага года, Міхаіл Мясніковіч паведаміў, што ад валавых паказчыкаў трэба паступова пераходзіць да сістэмы індыкатыўнага планавання. Галоўны прыярытэт — прыбытак, рэнтабельнасць, грошы на разліковым рахунку, экспарт і станоўчае сальда. «І гэта мы будзем патрабаваць на ўсіх узроўнях кіравання», — запэўніў прэм'ер-міністр.

### Транспартная пошліна — на дарогі

Міхаіл Мясніковіч падзякаваў дэпутатам за падтрымку ў намерах урада ўвесці дзяржаўную пошліну за допуск аўтамабіляў да дарожнага руху. Гэта можа стаць адным з варыянтаў дадатковай крыніцы бюджэтных паступленняў. Пры гэтым прэм'ер-міністр падкрэсліў, што атрыманыя такім чынам сродкі пойдуць на рамонт і будаўніцтва дарог.

Стаўкі дзяржпошліны, паводле яго даных, будуць залежаць ад аўтамабіля: для «Жыгулёў» — Br390 тыс. у год, «Фольксвагена» — Br650 тыс., «Мерседэса» — Br1 млн. «Так, мера, магчыма, і непапулярная, але мы (урад) прасілі б вас падтрымаць гэтую прапанову», — сказаў Міхаіл Мясніковіч, звяртаючыся да парламентарыяў.

Дзяржаўная пошліна за допуск аўтамабіляў да дарожнага руху — адно з новаўвядзенняў 2014 года. Дэпутаты абмяркоўвалі яго на пашыраным сумесным пасяджэнні пастаянных камісій Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы і па бюджэце і фінансах. Тады ішла размова, што стаўкі дзяржпошліны будуць устаноўлены ў памеры ад 1 да 25 базавых велічынь у залежнасці ад масы і віду транспартнага сродку, а таксама таго, хто ім валодае, — фізічная або юрыдычная асоба. Спаганяцца пошліна будзе ў час праходжання тэхагляду транспартнага сродку.

### Сумесныя кампаніі як неабходнасць

Шмат увагі ў сваім выступленні прэм'ер-міністр надаў інтэграцыйным працэсам, з якімі звязана развіццё эканомікі Беларусі.

«АЭП і Еўразійскі эканамічны саюз адбудуцца ў якасці геапалітычнай рэальнасці толькі пры магутным канкурэнтаздольным прамысловым ядры, якое прадстаўлена пятым і шостым тэхналагічнымі ўкладамі, — заявіў ён. — На гэта трэба нацэльваць усю эканамічную інтэграцыю, каб вырошчваць глабальныя кампаніі, якія будуць устойліва працаваць на сусветных рынках. Трэба ствараць сумесныя, транснацыянальныя карпарацыі, якія будуць абапірацца на рынак АЭП і не толькі. Будуць перамагаць у глабальнай канкурэнцыі».

У сваю чаргу, парламентарыі ўзнялі перад урадам праблемы самастойнасці рэгіёнаў, больш справядлівага вылічэння сярэдняга заробку, сумеснай работы над праектам закона аб інвестыцыях і шэраг іншых.

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** адзначыў, што дэпутаты і сенатары ўключыліся ў работу над праектамі бюджэту, асноўных кірункаў сацыяльна-эканамічнага развіцця на наступны год яшчэ на той стадыі, калі дакументы былі ў Савеце Міністраў.

— Гэта дало магчымасць нам абмеркаваць многія актуальныя пытанні, якія закранаюць эканамічныя і сацыяльныя працэсы, што адбываюцца ў краіне, — сказаў Уладзімір Андрэйчанка. — Шэраг прапаноў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў ужо знайшоў адлюстраванне ў адпаведных дакументах. Лічу, што сённяшняя наша сустрэча — гэта добрая магчымасць задаць пытанні членам урада, абмяняцца меркаваннямі па найбольш хвалюючых праблемах, знайсці агульныя падыходы па тых спрэчных пытаннях і момантах, па якіх яны пакуль не знойдзены.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## З новага года падаражэюць паслугі ЖКГ

**З 1 студзеня 2014 года плануецца павысіць плату за жыллёва-камунальныя паслугі ў разліку на тыпавую кватэру ў памеры, эквівалентным 5 доларам, з наступнай штоквартальнай індэксацыяй, прапарцыянальнай росту намінальнай заработнай платы. Пра гэта паведаміў міністр эканомікі Мікалай Снапкоў на сустрэчы з парламентарыямі.**

Наогул, плануецца, што ў снежні 2014 года плацяжы за жыллёва-камунальныя паслугі сям'і з 3 чалавек, якая пражывае ў 2-пакаёвай кватэры, пры нарматыўным спажыванні паслуг павялічацца ў параўнанні са снежнем 2013 года на 117 тысяч рублёў і складуць амаль 444 тысячы рублёў.

Мяркуецца, што на канец 2014 года ўдзельная вага плацяжоў насельніцтва за жыллёва-камунальныя паслугі ў сукупным даходзе сям'і, якая пражывае ў тыпавой 2-пакаёвай кватэры, пры двух працуючых, якія атрымліваюць зарплату, складзе 3,2%, калі абое з'яўляюцца бюджэтнікамі — то 4,4%, калі абодва з'яўляюцца пенсіянерамі — складзе 6,6%.

Палітыка тарыфаў на энергарэсурсы ў 2014 годзе будзе накіравана, перш за ўсё, на павышэнне канкурэнтаздольнасці айчынных вытворцаў шляхам зніжэння для іх цэн на прыродны газ і электраэнергію.

**P.S.** Урад выступае з ініцыятывай чарговага павышэння тарыфаў на газ і электраэнергію з 1 снежня.

**Святлана БУСЬКО.**

# ПЕНСІЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Патэлефанавала ўсхваляваная Марына Іванаўна з Мінска:

***— Чаму нельга перанесці атрыманне пенсіі з 12-га на 8-е чысло? Муж перанёс 2 інфаркты, патрэбны грошы. Банк не выдае раней. Чаму так? Ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацабароне Маскоўскага раёна сказалі: «Звяртайцеся куды хочаце! Нельга!»***

— Банк не можа выплаціць пенсію раней, чым яму будуць пералічаны грашовыя сродкі на гэтыя мэты. Сродкі на выплату пенсій пералічваюцца банкам згодна з зацверджаным графікам.

**Званок ад Ніны Аркадзьеўны Вайцяховіч, таксама з Мінска:**

***— Я кіроўца тралейбуса, на льготнай пенсіі з 2008 года. Памер пенсіі малы — 2.100.000 рублёў. Я працую, але ў студзені буду звальняцца. Ці будзе пераразлік пенсіі?***

— Які ў вас індывідуальны каэфіцыент заробку?

***— Я дакладна не памятаю...***

— Больш за 1,3?

***— Па-мойму, менш.***

— Калі індывідуальны каэфіцыент заробку звыш 1,3, пенсія ў выпадку звальнення трохі павялічыцца. Калі ў вас індывідуальны каэфіцыент заробку меншы за 1,3, то памер вашай пенсіі не павялічыцца, таму што вам пенсія ў перыяд работы не абмяжоўвалася. Але ў любым выпадку вы абавязаны паведаміць органам па працы, занятасці і сацабароне аб сваім звальненні. Гэта неабходна для таго, каб у нас была аператыўная і дакладная інфармацыя аб працуючых пенсіянерах. Напрыклад, калі вы памятаеце, у 2011 годзе пенсіянерам выплачвалася матэрыяльная дапамога, але толькі тым, хто не працуе.

**Мікалай з Гомеля пацікавіўся:**

***— Да лістапада працоўная пенсія налічвалася, зыходзячы з сярэднестатыстычнай зарплаты 4482 тыс. рублёў. Сярэдні заробак за 3 квартал 2013 года склаў 5460 тыс. рублёў, што на 21,7% перавысіла ранейшую суму. Чаму пенсіі з лістапада налічваюць, зыходзячы не з сярэдняй зарплаты за 3 квартал, а з сумы 4724 тыс. рублёў?***

— Рашэнне аб аб'ёме пераразліку было прынята, зыходзячы з фінансавых магчымасцяў.

**Іван Васільевіч Петрушкевіч з вёскі Тонава Карэліцкага раёна трывожыцца:**

***— Паштальён сказаў, што пенсію мужа можна аддаць жонцы, а пенсію жонкі — мужу. А калі муж супраць, каб яго пенсію атрымлівала жонка? Ці, наадварот, жонка супраць?***

— Пенсію мужа можна аддаць жонцы толькі ў тым выпадку, калі ў яе ёсць даверанасць на атрыманне гэтай пенсіі, — супакойвае яго прадстаўнік міністэрства.

**Святлана БУСЬКО.**

## САЛЮТ НАД СОЖАМ І ПРОНЯЙ

**70 гадоў таму, 25 лістапада 1943 года быў вызвалены ад немцаў маленькі горад Прапойск, які атрымаў назву Слаўгарад.**

Як паведаміла намеснік старшыні Слаўгарадскага райвыканкама Святлана Язерская, святочныя мерапрыемствы адбудуцца ў гэтую суботу. Плануецца, што ўдзел у іх прымуць губернатар Магілёўскай вобласці Петр Руднік, госці з суседніх краін, сярод якіх — сваякі загінулых на тэрыторыі раёна вызваленцаў. У гарадскім парку на месцы брацкай магілы будуць урачыста перапахаваны астанкі аднаго з воінаў, які загінуў у 1941-м каля вёскі Аляксандраўка.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# МАДЭРНІЗАЦЫЯ — НА КАНТРОЛІ

**Міжведамасная рабочая група на чале са старшынёй КДК Аляксандрам Якабсонам пабывала на Магілёўшчыне, дзе ацаніла ход мадэрнізацыі і дакладнасць выканання даручэнняў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі на двух прадпрыемствах дрэваапрацоўчай галіны — адкрытых акцыянерных таварыствах «Магілёўдрэў» і «ФанДОК». Гэтая група, у якую ўвайшлі прадстаўнікі Генпракуратуры, МУС, МНС, Мінбудархітэктуры, Мінпрыроды, Міністэрства аховы здароўя, была створана па даручэнні кіраўніка дзяржавы пасля яго наведвання таварыства «Барысаўдрэў» 8 лістапада.**

Першае выязное пасяджэнне рабочай групы прайшло на ААТ «Магілёўдрэў». Каб прааналізаваць сітуацыю і зрабіць высновы, спецыялісты прайшлі па цэхах, абследавалі тэрыторыю прадпрыемства і яго ваколіц. Падчас пасяджэння рабочай групы былі заслуханы справаздачы прадстаўнікоў мясцовай улады і дадзена ацэнка працы кіраўніцтва прадпрыемства, а таксама работнікаў ведамстваў і арганізацый, якія прымаюць удзел у рэалізацыі праекта.

На 1 лістапада гэтага года «Магілёўдрэву» на фінансаванне мерапрыемстваў інвестпраекта было накіравана амаль 87% прадугледжаных бізнес-планам фінансаў — 18,6 млн еўра. Але з 5 мерапрыемстваў, якія ўключае ў сябе інвестпраект, пакуль рэалізаваны 4. Пры гэтым не забяспечаны выхад на праектныя магутнасці ніводнага аб'екта.

7 лістапада быў сарваны тэрмін уводу ў эксплуатацыю мэблевага цэха. Як адзначыў начальнік упраўлення КДК Магілёўскай вобласці Юрый Фралоў, асноўная прычына — недастатковае фінансаванне гэтага аб'екта. «Кіраўніцтвам прадпрыемства, канцэрнам «Беллеспаперапрам» і іншымі ўстановамі, якія займаюцца праектаваннем і фінансаваннем, не былі прынятыя ўсе меры, каб аб'ект фінансаваўся рытмічна, — растлумачыў ён. — Яшчэ адна з вострых праблем — гэта няпоўная загрузка асноўных вытворчых магутнасцяў, усіх тэхналагічных ліній — лесапілавання, вытворчасці мэблевага шчыта і вытворчасці ў цэху №1. Па ацэнцы камітэта, толькі за кастрычнік прадпрыемства недаатрымала 380 тысяч еўра».

За зрыў тэрміну выканання даручэнняў Прэзідэнта Беларусі на ААТ «Магілёўдрэў» шэраг кіруючых работнікаў ужо прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці. Але, як запэўніў дырэктар таварыства Алег Траццякоў, а таксама кіраўнікі будаўнічай арганізацыі, якая працуе на аб'екце, усе будаўнічыя, а таксама пусканаладачныя работы будуць завершаны да канца гэтага года.

Падчас праверкі прадпрыемства рабочай групай выяўлены шэраг недахопаў, звязаных з утрыманнем тэрыторыі, захаваннем санітарных нормаў і правілаў.

— Уражанні не самыя лепшыя, — падзяліўся меркаваннем наконт убачанага старшыня КДК Аляксандр Якабсон. — Безумоўна, на рэканструкцыю такіх старых прадпрыемстваў, як «Магілёўдрэў», накладвае адбітак іх узрост. А яму ўжо 80 гадоў. Тым не менш відавочна, што кіраўніцтва прадпрыемства недапрацоўвае. Няма нармальных бытавых умоў, нізкая культура вытворчасці. І штрафамі тут справу не вырашыць. Кантралюючым органам трэба дамагацца рашэння тых праблем, якія яны тут бачаць. Калі ёсць недахопы, трэба заставацца на прадпрыемстве, пакуль яны не будуць вырашаны.

Аляксандр Якабсон таксама выказаў заклапочанасць і перспектывамі рэалізацыі будучай прадукцыі. На «Магілёўдрэве» на наступны год заключаны кантракты толькі на 15% ад меркаваных аб'ёмаў выпушчаных вырабаў.

Кіраўнік КДК папрасіў старшыню Магілёўскага аблвыканкама Пятра Рудніка ўзяць пад асабісты кантроль праект па мадэрнізацыі прадпрыемства і зрабіць усё неабходнае, каб увесці ў строй мэблевы цэх да канца гэтага года.

Шматлікія факты безгаспадарчасці выяўлены падчас праверкі бабруйскага ААТ «ФанДОК». Паводле інфармацыі КДК Магілёўскай вобласці, тэрміны рэалізацыі інвестпраекта па шэрагу аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын пераносіліся шэсць разоў, двойчы распрацоўваліся бізнес-планы, пашыраўся склад мерапрыемстваў і пералік набываемай тэхнікі і абсталявання. Кошт рэалізацыі праекта ўзрос у параўнанні з першапачатковай лічбай больш чым на 30%, з 38 да 49 мільёнаў долараў ЗША. Усяго на 1 лістапада гэтага года на фінансаванне інвестпраекта накіравана 37 мільёнаў долараў.

Сёння праект уключае ў сябе 7 мерапрыемстваў, з якіх да канца рэалізавана толькі адно — будаўніцтва міні-ЦЭЦ. Але з-за частых паломак кацельнага абсталявання «ФанДОК» нясе значныя выдаткі па яго рамонце. Не ўведзены ў эксплуатацыю завод па вытворчасці ДСП. Будаўніча-мантажныя работы на ім практычна завершаны, але працягваецца пусканаладка абсталявання і ліквідацыя шматлікіх заўваг наглядных органаў. Зацягнуты тэрміны па мадэрнізацыі дзейнага фанернага завода, цэха па вытворчасці піламатэрыялаў. Шмат нараканняў выклікаў і санітарны стан тэрыторыі прадпрыемства.

Па выніках пасяджэння, кіраўніцтву прадпрыемства і мясцовым уладам даручана да канца месяца навесці парадак на тэрыторыі прадпрыемства, да 31 снежня гэтага года ўвесці ў эксплуатацыю завод па вытворчасці ДСП і пачаць выпуск прадукцыі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# УБАЧЫЦЬ, ПАЧУЦЬ І ЗАПОМНІЦЬ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— З чаго пачынаецца павага да саперніка? — стоячы на барцоўскім дыване, пытаецца ў дзяцей Карэлін.

— З поціску рукі, — не вельмі ўпэўнена, але адразу адказвае нехта з дзяцей.

— А яшчэ? Добра, я дам вам падказку. Што правярае суддзя, калі вы выходзіце на дыван?

— Пазногці! — хорам адгукнуліся маленькія барцы.

— Калі рыхтуецеся да трэніроўкі, спаборніцтваў, паважаеце саперніка, у вас павінны быць падстрыжаны пазногці. Абавязкова. Трэба выглядаць падцягнута, артыстычна... Вісарыён Бялінскі, здаецца, сказаў, што барацьба — гэта ўмовы жыцця. А Міхаіл Юр'евіч Лермантаў неяк адзначыў, што там, дзе няма змагання, жыццё сумнае. Таму вы, напэўна, каб не сумаваць, і займаецеся барацьбой, — адзначыў Аляксандр Аляксандравіч і дадаў: — Вы — частка вялікай сусветнай барцоўскай сям'і. І ў нас ёсць выдатны пастулат: «На дыване сапернікі, а ў жыцці — сябры».

Амаль усё спатканне з трохразовым алімпійскім чэмпіёнам (акрамя невялічкіх практыкаванняў) было ў форме «пытанне—адказ». На Карэліна сыпаліся пытанні, на якія ён ужо адказваў калісьці. Але Аляксандр Аляксандравіч не адбіваўся ад іх і ў чарговы раз адказваў...

— Як я трапіў у барацьбу? Да нас у школу прыйшоў трэнер Віктар Міхайлавіч Кузняцоў. Так у 1981 годзе, ва ўзросце 14 гадоў, я і трапіў у залу. Тады і даведаўся ад Віктара Міхайлавіча, што барацьба — гэта вельмі цікавая частка жыцця.

— Маё імя Грыша, — падымаючыся з месца, звяртаецца да Карэліна маленькі хлопчык. — А колькі часу вы займаецеся барацьбой?

— Грышачка, я ўжо адношуся да катэгорыі «мэбля». Мяне возяць і паказваюць пажартаваў Аляксандр Аляксандравіч. — Праўда, я яшчэ люблю хадзіць на трэніроўкі. Займаўся барацьбой я 19 гадоў — да 2000 года. І скончыў тады, калі заняў другое месца на Алімпіядзе ў Сіднэі.

— Вам было крыўдна, калі прайгралі на Алімпіядзе?

— Мне і цяпер крыўдна. Чаму Расія пасля паядынку не падала пратэст? Таму што я ніколі з дапамогай адвакатаў не станавіўся чэмпіёнам. Я стаўлюся да гэтага больш катэгарычна, чым спрабую распавесці. Мы рыхтуем барцоў, а не суцяжнікаў. Ведаеце, у чым наша сіла? У катэгарычнасці.

— А якія косткі вы ламалі?

— У мяне ламаліся пясцевыя косткі на абедзвюх руках. Жылы рваў, рэбры ламаў, з-за пералому нагі паўгода на мыліцах хадзіў...

— Вы ўдзельнічалі ў баях без правілаў?

— Аднойчы. І гэта — пляма ў маёй біяграфіі. У 1999 годзе я сустрэўся ў Японіі з неверагодна папулярным там чалавекам Акірам Маэда. Мяне ўсё папярэджвалі, каб я прыбярог сябе, бо наперадзе былі чэмпіянат Расіі, Алімпіяда... Мы выйшлі на рынг, павіталіся, бой распачаўся. І я бачу, як каля майго твару пралятае нага, а на падэшве напісана лічба 47. Першая думка, якая прыйшла ў галаву: «Навошта ты сюды пайшоў? Стукне ён цябе па галаве сваім 47-м памерам, і што пасля будзеш рабіць? Па чатыры разы на дзень з сустрэчным вітацца?» Я так спужаўся, што схапіў саперніка за галаву, а ён і «задыхнуўся».



Аляксандр Карэлін адразу знайшоў са школьнікамі агульную мову

Пасля Аляксандр Карэлін яшчэ доўга фатаграфаваўся і раздаваў аўтографы, а потым паведаміў прэсе, што...

— Для не самага вялікага беларускага горада тут цудоўныя ўмовы: лядовая пляцоўка гарманічна суседнічае з залай для барацьбы. Тое, што ўсё гэта зроблена пры прыватнай падтрымцы, годна для тыражавання не толькі ў Беларусі.

— Аляксандр Аляксандравіч, у барацьбе ўвесь час мяняюцца правілы.

— Я не суадношу сябе з ініцыятарамі падобнага. Да правілаў трэба ставіцца кансерватыўна. За апошнія 20 гадоў мы гэтым спудзілі добрую частку нашай публікі. Менавіта таму нам у лютым далі чорную метку з намёкам на выключэнне з праграмы Алімпійскіх гульняў. Але зараз дзейнічае рэдакцыя правілаў, якую прынялі 30 гадоў таму. І ажыўленне барацьбы, інтарэс гледачоў кажа пра тое, што мы зрабілі ўсё правільна. Барэц на дыване — гаспадар свайго лёсу. Апошнія 7 гадоў узнагароды раздавалі суддзі.

— Вы хваравіта ўспрынялі навіну пра магчымае выключэнне барацьбы з алімпійскай сям'і?

— Успрыняў як асабістую абразу. Праўда, я лічу, што лепш удзельнічаць у падобных сустрэчах, чым ладзіць галадоўкі і здаваць медалі. Ад гэтага аддае папулізмам.

Для маленькіх удзельнікаў сустрэчы з Карэліным падобныя пытанні яшчэ цяжкія для ўспрымання. Яны гартаюць прыгожыя кнігі пра легендарнага барца Івана Паддубнага, якія для іх прывёз вядомы госць, і, напэўна, ужо ведаюць, што скажуць дома пра гэтую падзею. А вось мясцовы школьнік Арсен Сланеўскі ўжо збіраецца ў будучыні паехаць на Алімпіяду.

— Гэты шанц упусціць нельга! — кажа хлопчык і яшчэ мацней прыціскае да грудзей том з выявай Паддубнага.

**Тарас ШЧЫРЫ.**
**Фота аўтара.**

*г. Бяроза*

# ДЗІК-СЯГОЛЕТАК «ПАДЛАЖЫЎ СВІННЮ»...

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**З вёскі Койры Пастаўскага раёна патэлефанавала ўсхваляваная Ала Мікалаеўна Таргові́ч: прымушаюць тэрмінова калоць свіней. «Былі з сельскага Савета, міліцыя... Загадалі зрабіць гэта цягам двух дзён. Учора мы закалолі адну, сёння збіраліся зрабіць тое ж з другой. З сельскага Савета прыспешваюць, не задаволеныя тым, што марудзім. Але ж гэта не так проста. А з іншага боку — навошта калоць свіней? Кажуць, што недзе з тыдзень таму побач з вёскай здабылі ў лесе дзіка. І быццам бы ў яго выявілі афрыканскую чуму. Цяпер гавораць, што ствараецца санітарная зона, таму і трэба калоць свіней. Дык чаму дзікоў не звядуць паляўнічыя? Мы ж чулі, як Прэзідэнт загадаў зрабіць гэта там, дзе патрэбна. Ніколі такога не было, а тут упершыню за 43 гады тыя дзікі прыходзяць да мяне «ў лазні мыцца»: перарылі ўвесь агарод. Чаму іх не паадстрэльваюць?»**

Заяўніца задала шмат пытанняў. На некаторыя мы паспрабавалі даць адказ адразу ж. Напрыклад, адносна таго, што праводзіць стральбу і знаходзіцца з заражанай паляўнічай зброяй у населеных пунктах і на адлегласці менш за 200 метраў ад крайняга збудавання забараняецца. Гэта прапісана ў правілах вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання. А на здабычу дзікіх жывёл ёсць ліміты... Аднак многія адказы патрабавалі каментарыя з месца падзей.

Першым мы патэлефанавалі начальніку Глыбоцкай міжрайінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Аляксею Протасу (Пастаўскі раён у ліку некалькіх іншых — сфера адказнасці міжрайінспекцыі.) Аляксей Віктаравіч пацвердзіў, што паблізу вёскі, дзе жыве заяўніца, была знойдзена туша памерлага дзіка-сяголетка.

— Паколькі гэта дзік сёлетняга года нараджэння, значыць, быў статак. Калі хворы адзін, значыць, хворыя і іншыя. Калі б было нешта сур'ёзнае, два-тры дні — і былі тушы іншых загінулых жывёл. Аднак ніхто іх больш не знаходзіў. Пра вынікі экспертызы тушы сяголетка мне пакуль афіцыйна нічога не вядома, таму я не магу забараніць паляўнічаму, які на законных падставах здабыў трафей, забраць сабе тушу, — паведаміў Аляксей Протас.

Ён таксама пацвердзіў, што ў згаданых мясцінах водзіцца вялікае пагалоўе дзікоў (якія могуць мігрыраваць), а ліміты на здабычу на год ужо практычна вычарпаны.

Аднак галоўнае пытанне — ці быў сяголетак хворым на чуму — заставалася без адказу. Адразу пагутарыць з галоўным ветэрынарным урачом Пастаўскай райветстанцыі Генадзем Лютынскім не атрымалася: ён быў на пасяджэнні ў райвыканкаме. Не ўдалося звязацца і са старшынёй Шыркаўскага сельскага Савета (на тэрыторыі якой знаходзіцца вёска Койры) Аленай Рудніцкай: яна на той момант таксама была недаступнай. Аднак нам патлумачылі, што вяскоўцы падпісалі паперы — забіць свіней да 23 лістапада. І гаворка ідзе пра стварэнне двухкіламетровай санітарнай зоны. У Пастаўскім лясгасе сказалі, што дзік быў знойдзены на тэрыторыі раённай структуры «Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў». Яе старшыня Алег Карпік пацвердзіў гэты факт, адмовіўшыся ад іншых каментарыяў. І патлумачыў прычыну: пасяджэнне ў райвыканкаме, куды і ён павінен быў накіравацца, і дзе былі іншыя спецыялісты, прысвечана якраз гэтаму пытанню. Доўжылася яно большую частку дня.

Пасля яго завяршэння бліжэй да вечара нам удалося перагаварыць з галоўным ветэрынарным урачом Пастаўскай райветстанцыі Генадзем Лютынскім, які пацвердзіў, што дзік-сяголетак быў хворы на афрыканскую чуму. Потым сувязь перарвалася... Больш змястоўнай атрымалася гутарка са старшынёй Шыркаўскага сельскага Савета Аленай Рудніцкай.

— Так, пацверджана, што дзік быў хворы на чуму. З абласной ветстанцыі прыйшлі дакументы, — сказала Алена Генрыхаўна.

Якімі будуць далейшыя крокі па прадухіленні небяспекі, гаварыць суразмоўца не стала, спаслаўшыся на тое, што ніякіх дакументаў на руках пакуль не мае. На гэты момант вынікала, што двухкіламетровая санітарная зона вакол вёскі Койры стваралася недарма. Вяскоўцы павінны выканаць прадпісанне і пазабіваць свіней. Прадукцыю забою яны могуць пакінуць сабе...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЦІ ВАРТА ЗВЯРТАЦЦА ДА МАКБЕТА?

## Славутая трагедыя Шэкспіра на сцэне коласаўцаў

**Зварот да сусветных узораў класічнай драматургіі для дырэктара — мастацкага кіраўніка Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа Валерыя Анісенкі — справа заканамерная.**


Юрась Цвірка ў ролі Макбета.

Больш за год таму, калі заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Валеры Анісенка ўзначаліў коласаўскі тэатр, прыхільнікі віцебскай Мельпамены адчулі: да нас вяртаецца атмасфера той сцэны, з якой гучыць сапраўднае слова, якому нельга не паверыць і якога чакаеш...

Пастаноўка «Макбет» Валерыя Анісенкі стала падзеяй у тэатральным жыцці коласаўцаў, добрай прыкметай часу вяртання да вытокаў, натуральным выйсцем за межы звыклага. Праца над шэкспіраўскай трагедыяй была для яго не новай. Двойчы Анісенка звяртаўся да гэтага матэрыялу падчас мастацкага кіраўніцтва Рэспубліканскім тэатрам беларускай драматургіі, прадстаўляў спектакль гледачам у Англіі, дзе меў безумоўны поспех. Ён застаецца верным пастулату: каб годна працаваць з нацыянальнай драматургіяй, трэба добра ведаць, што сабой уяўляюць лепшыя ўзоры сусветнай класічнай драмы.

«Макбет» на сцэне коласаўскага тэатра наскрозь пранізаны дынамікай, рухам, у якім цесна пераплецены гістарычны час шатландскага караля Дункана і сучаснасць з яе алегарычным светаўяўленнем. Спектакль атрымаўся даволі лаканічным. Дзве дзеі пралятаюць як на адным дыханні, і гэта не дазваляе гледачу расслабіцца, трымае ўвагу залы, ствараючы адзіную атмасферу перажывання гістарычных падзей і маральнага выбару чалавека. Лаканічнасць пастаноўкі ў той жа час убірае ў сябе ўсю шырыню і глыбіню шэкспіраўскай трагедыі, надае спектаклю сучасны імпэт. Адчуць подых сучаснасці на сцэне дапамагае не толькі цікавая рэжысура, але і выразная работа мастака па касцюмах Ніны Гурло, таленавітая харэаграфія Дзіяны Юрчанкі, сцэнаграфія і святло — мастак-пастаноўшчык Аляксандр Касцючэнка. Рэжысёр наўмысна тонка і асцярожна ўводзіць у тканіну спектакля элементы эротыкі зусім не з мэтай такім чынам пазабавіць гледача. Здаецца, гэта робіцца дзеля таго, каб пазбегнуць суцэльнага патоку жорсткасці і гвалту, карціны, тыповай для Сярэднявечча. Каб наблізіць змест тэатральнай ігры да звычайных чалавечых пачуццяў. Газета «Scottish art» адзначала ў жніўні 1996 года, калі «Макбет» Валерыя Анісенкі быў паказаны на міжнародным фестывалі ў Шатландыі: «Гледачы ўбачылі ўнікальны сінтэз феерыі, жарсці і гвалту...» Дарэчы, спектакль беларускага рэжысёра-пастаноўшчыка быў названы тэатральнай з'явай, якая не мае аналагаў у 50-гадовай гісторыі Эдынбургскага тэатральнага фестывалю.

І вось 2013 год. «Макбет» вяртаецца на віцебскую сцэну. Прэм'ерны паказ адбыўся ў маі на Міжнародным тэатральным фестывалі «Мельпамена Таўрыі» пад адкрытым небам Херсона. Украінская крытыка вітала прэм'еру коласаўцаў, вызначыла ўнікальнасць сцэнічнага ўвасаблення, эксперыментальнасць. З мэтай наблізіць драматычны час Макбета да сучаснай аўдыторыі рэжысёр выводзіць акцёраў за межы сцэнічнай пляцоўкі, такім чынам уключаючы ў гульню тэатральнага гледача.

Ролю Макбета выконвае Юрась Цвірка. Акцёр з амплуа камедыйнага хітруна нечакана раскрываецца перад гледачом зусім з іншага боку. Сапраўды, калі Гасподзь надзяліў талентам, дык ён не можа быць аднабаковым! Юрась упэўнена дэманструе шырокі дыяпазон свайго акцёрскага майстэрства. Яго Макбет то ахоплены жарсцю, то паглыбляецца ў філасофскія разважанні, то раптоўна на вачах змяняецца тварам і прадстае хлуслівым д'яблам, якога яшчэ нядаўна ўсе лічылі сапраўдным героем. Шматаблічнасць Макбета ў выкананні Цвіркі ўражвае і падаецца пераканаўча. Яго выдатная работа не пакідае гледача абыякавым, прымушае ўзвысіцца над будзённым, абуджае да лепшага, да хараства. Так, у гэтым і заключаецца магічная сіла мастацтва! Катарсіс — ачышчэнне праз душэўныя перажыванні.

— Работа над «Макбетам» была і складанай, і лёгкай, — гаворыць Валерый Анісенка. — Галоўны вынік — адкрыццё магутнага драматычнага акцёра Юрася Цвіркі. Нечакана, неспадзявана... Ён здолеў мяне пачуць і пайсці за мной. Гэта работа стала прыкладам работы для іншых. Калі так будзе і надалей, магутная коласаўская трупа ўзрасце.

Юрась Цвірка працуе ў адным тандэме з Ірынай Цішкевіч (лэдзі Макбет), якая не саступае мужнаму супругу ў каларыце асобы, што прагне ўлады і пасля захлынаецца, гіне ў гэтым прагненні. Макдуф (Георгій Лойка), Банко (Яўген Бераснеў), Стары (Валянцін Цвяткоў), пачварныя вядзьмаркі — усе ствараюць выразныя вобразы шэкспіраўскай трагедыі, якая і сёння вучыць сучаснікаў не ператвараць жыццё ў «паганы балаган», бо ўсё адно «канец з'яўляецца пачаткам». «Маральны кодэкс», вызначаны класікам, вядомы кожнаму. Але ж адкуль чэрпае сваю сілу тая самая жудасць, «якой яшчэ на свеце не было»?

Пастаноўка «Макбета» на коласаўскай сцэне не звужаецца рамкамі нейкага тэатральнага эксперыменту. Гэта самастойны феномен, суцэльная навука, сапраўдная творчая лабараторыя для акцёраў, якія знаходзяцца ў пастаянным пошуку. Як не пагадзіцца з тым, што добрая класічная драматургія ў пастаноўцы сучаснага рэжысёра дазваляе акцёру спаўна раскрыць свае магчымасці. У выйгрышы аказваюцца ўсе, і ў першую чаргу — гледачы.

**Святлана ДЗЯДЗІНКІНА.**

■ Дзеля памяці

# Птушка

## Лістападаўскія ўспаміны пра Яўгенію Янішчыц



*Сонца зачапілася за стрэхі,*
*Акрапіла мёдам верасы...*
*«Я люблю-ю!» — панесла*
*ўдалеч рэха.*
*«Я люблю-ю!» — азваліся лясы.*

*«Я люблю-ю!» — пацвердзілі дубровы,*
*Светлыя, як лебедзя крыло.*
*І для песні падказала словы*
*Роднае палескае сяло.*

*У грудзях прачнулася натхненне.*
*І дыханне заняло.*
*«Люблю-ю!»*
*І душа, як чуйнае карэнне,*
*Зноў адчула родную зямлю...*

**Яўгенія ЯНІШЧЫЦ.**

Пяшчотным сэрцам яна выпускала словы, яны разляталіся, напаўнялі прастору, як птушыныя спевы: пяшчотай і гармоніяй. Нібыта на крылах ляцела насустрач жыццю, захапляючыся ўсім, што яно падносіла як дарункі: каханнем і поспехам. Толькі крылы давалі магчымасць хоць колькі пратрымацца, калі пасыпаліся ўдары лёсу — жаночыя і чалавечыя. Але бывае цяжар, які мацнейшы за сілу крылаў, і, калі думаеш, што ў нейкі момант хочацца проста адарвацца ад таго месца, ад той кропкі, дзе няма руху, і ўзляцець у паднябессе, гэты цяжар цягне ўніз. І крылатая душа рвецца на волю. Ляціць...

Паэтка Яўгенія Янішчыц — чалавек палёту. Яе талент нёс яе нібыта на крылах: маладая паэтка адразу на сябе звярнула ўвагу сваёй пранікнёнай лірыкай, пачала друкавацца. Адзін за адным падыходзілі зборнікі вершаў: «Снежныя грамніцы» (1970), «Дзень вечаровы» (1974), «Ясельда» (1978), «На беразе пляча» (1980), «Пара любові і жалю» (1983), «Каліна зімы» (1987). За кнігу «Пара любові і жалю» яна атрымала Дзяржаўную прэмію БССР імя Янкі Купалы. А ў 1988 годзе выйшаў зборнік выбраных твораў «У шуме жытняга святла».

Пра зборнікі паэткі ўзгадвалі ў гэтыя дні: 20 лістапада адзначалася 65-годдзе Яўгеніі Янішчыц. Але без яе: у лістападзе 1988 года жанчына-птушка загінула...

Яе называлі «непрыручанай птушкай» Палесся, «палескай ластаўкай» — таму што карані таленту яе ішлі ад роднай зямлі, ад тых мясцін, дзе яна адчула хараство роднага слова, якое імкнулася ўсяляк падкрэсліць у сваіх творах. Па словах Васіля Быкава, «Жэня была самая таленавітая з усіх самых таленавітых паэтэс Беларусі, самая цнатлівая і дасканалая».

Успаміны пра яе і яе словы былі галоўнымі на вечарыне памяці паэткі, якую наладзілі Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры і Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі.

«Пачынаецца ўсё з любові...» — гэтыя словы Яўгеніі Янішчыц можна лічыць лейтматывам усяго яе жыцця, гэткім жа сэнсам была напоўнена яе творчасць. Таму яны і былі абраны як назва для выставы, дзе сярод зборнікаў паэзіі, якія былі выдадзены пры жыцці аўтаркі, можна пабачыць сучасныя публікацыі пра яе, перавыданні твораў, а таксама пераклады Яўгеніі Янішчыц на беларускую мову рускіх, украінскіх аўтараў, яе літаратурна-крытычныя артыкулы. І калі думаць пра ўнёсак чалавека ў жыццё, то наўрад ці яго варта вымяраць колькасцю пражытых гадоў. Можна — яскравасцю таленту. Адметнасцю думак. Вастрынёй пачуццяў, у якіх яна раствaралася і якімі сілкавалася — як жанчына, як маці. І як паэт.

Яна вельмі чула рэагавала на свет. Шукала ў ім крыштальную чысціню. І шчыра спадзявалася, што, захоўваючы ўласную чысціню, рана ці позна можна заслужыць спагаду лёсу. Але ён з гэтым ніяк не спяшаўся, падкідваючы розныя выпрабаванні ў выглядзе хвароб — сваіх і блізкіх людзей, у выглядзе праблем, якія, можа, і вырашаліся б пакрысе... І птушкі, бывае, выбіваюцца з сіл, якіх ужо не хапае, каб узляцець і адчуць палёгку...

Вершы Яўгеніі Янішчыц напоўнены жыццём і ўсімі тымі клопатамі і пачуццямі, якое яно дорыць. Яны напоўнены і тым болем, з якім сутыкаецца чалавек, і той надзеяй, якую знаходзіць у сабе самім, каб існаваць далей. Але ў таленавітых людзей ёсць прывілея — існаваць заўжды, нават тады, калі гэта немагчыма. Янішчыц існуе ў вершах. Пачытаем?

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

❍❍❍

*Глыбы думак. Праху глыбы —*
*За сівою даўнінай*
*Паміж Сцылай і Харыбдай,*
*Паміж сценкай і сцяной.*
*Адзіноты век? Гукання?*
*Не пачуўшы голас мой,*
*Ты прышлеш мне прывітанне*
*Паміж сонцам і зямлёй.*
*Беспрытул? Ды, дзякуй Богу,*
*Не згасае успамін.*

*Дай мне ласкі на дарогу,*
*Дзікі ландыш і палын.*
*Будзе светла мне і горка*
*За лагчынай, за гарой*
*Паміж ранішняю зоркай*
*І вячорнаю зарой.*

### ...І прасвечваюць нашыя сэрцы

*Як адбіткі вякоў, як набыткі,*
*Што не ў сілах здалець і смуга, —*
*Легендарныя коні і світкі,*
*Вышываная — кроўю — сцяга...*
*Нашы плечы ў баях не паслаблі,*
*Хоць крышыў іх нягоды віхор.*
*Чаратамі — сталёвыя шаблі*
*Над прадоннем былінных азёр.*
*Наша моц гартавалася ў буры,*
*На гарачых кастрах пачуцця.*
*...Неабутыя славы катурны*
*Пры высокім дыханні жыцця.*
*Песня й праўда — бясцэнныя зліткі*
*(Чужакам хай пасвецяць рублі).*
*Легендарныя коні і світкі —*
*Ўсё разбуджана гулам зямлі!*
*На паверцы стаім, па праверцы,*
*Растапляючы камень і лёд.*
*І прасвечваюць нашыя сэрцы*
*Каліноўскі. Купала. Народ.*

■ Нотны радок

# «САНОРУС» І ПОЛЬСКІЯ КАМПАЗІТАРЫ

## Творы, якія гучаць у Беларусі ўпершыню



**23 лістапада ў Белдзяржфілармоніі будзе прадстаўлена канцэртная праграма, прысвечаная юбілеям славутых польскіх кампазітараў, шырока вядомых не толькі ў сябе на радзіме, але і ва ўсім свеце: 100-годдзю з дня нараджэння Вітольда Лютаслаўскага і 80-годдзю з дня нараджэння Хенрыка Мікалая Гурэцкага. Асаблівасць канцэрта ў тым, што ўсе творы гучаць у Беларусі ўпершыню.**

Такую праграму падрыхтавала беларуская музычная капэла «САНОРУС» на чале з мастацкім кіраўніком і дырыжорам Аляксандрам Хумалам. Таксама ў канцэрце бярэ ўдзел сімфанічны аркестр Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі пад кіраўніцтвам дырыжора, народнага артыста Беларусі Аляксандра Анісімава. «Зоркамі» гэтага канцэрта стануць польская оперная дзіва Юстына Самборска і выдатны беларускі піяніст, лаўрэат міжнародных конкурсаў Юрый Бліноў.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Выставы

# ДЗВЕ

## Дзве выставы фатаграфій у Мінску: падарожжа па Індыі і вяртанне да каранёў

**Паколькі кінематограф непазбежна імкнецца да максімальнай дакументальнасці, выяўленчае мастацтва таксама выбірае найбольш дакументальны спосаб фіксацыі рэальнасці — фатаграфію. Вы ніколі не задумваліся, чаму выявы іншых, незнаёмых нам людзей і мясцін часам бываюць такімі прыцягальнымі? Гэтымі днямі ў Мінску можна паглядзець дзве надзвычай цікавыя фотавыставы. І задумацца.**

**1. «Масала» Алесі Філіпавай у Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр-т Незалежнасці, 47).**

Масала — гэта назва традыцыйнай індыйскай гарбаты з кардамонам, імбірам, насеннем фенхелю, чорным перцам, гваздзікай. Цудоўнае спалучэнне гарачых усходніх спецый у час набліжэння зімы. Зрэшты, як і стракатыя жыццядайна-эзатэрычныя фотаздымкі маладога фатографа Алесі Філіпавай. Алеся скончыла факультэт інфармацыйных тэхналогій Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. З 2008 года працуе ў сферы камп'ютарнага дызайну і графікі, а з 2010 года займаецца жывапісам і фатаграфіяй. **Алеся гаворыць пра свае індыйскія фотаздымкі:**

— Мне хочацца, каб людзі выйшлі з сацыяльна навязанага матэрыялістычна накіраванага мыслення, і праз кадры і тых асоб, якія на іх адлюстраваны, задумаліся, што не новы айфон або «Фальксваген» робіць людзей шчаслівымі. Што толькі тыя жывыя, хто любіць узаемаадносіны. Прастата і шчырасць маюць рэальны кошт у гэтым свеце...


На выставе «Непатрэбнае сваяцтва».

Сапраўды, гледзячы на гэтыя каляровыя экзатычныя кадры з чужога далёкага жыцця, пераконваешся, што яно можа быць поўным і паўнавартасным і без усіх гэтых лішкаў IT-цывілізацыі. Шум, грукат, таўкатня людзей, перазвон Пуджа з храма, песні, кіламетры яркіх сары, чырвоныя біндзі, «Ача» з характэрным калыханнем галавой... У кожнага свая гісторыя, свая Індыя. Беларусы на яе чамусьці, наогул, вельмі ласыя. І ў мяне да яе выпрацавалася асаблівае стаўленне пасля некаторых, праўда, трагічных падзей нядаўняга мінулага... Што так вабіць беларусаў у гэтую краіну каляровых летуценняў і старадаўніх легенд? Філолагі сцвярджаюць, што ў санскрыце і шэрагу славянскіх моў вельмі шмат сугучных слоў. Можа, гэта і ёсць нейкае старажытнае генетычнае сваяцтва, якога не відаць няўзброеным вокам?.. У любым разе, фотаздымкі з Індыі не могуць быць непрыгожымі. Тут нават і не варта карыстацца нейкімі мастацтвазнаўчымі тэрмінамі, каб ахарактарызаваць гэтыя фотаздымкі. І калі я гляджу на кадры, зробленыя Алесяй, то бачу не проста экзотыку, а мноства прыгод, цікавых і нават небяспечных гісторый, якія магла перажыць фатограф, палюючы на свае ўнікальныя кадры. А гэта цэлае жыццё, персанальная рэальнасць, асабістая Індыя!

Выстава працуе да 11 студзеня.

**2. «Непатрэбнае сваяцтва» са збораў Сярэбранікава і Ясевіча ў галерэі Л. Шчамялёва (пр-т Ракасоўскага, 49).**


Фотаздымак Алесі Філіпавай з серыі «Масала. Падарожжа па Індыі».

У галерэі Леаніда Шчамялёва ў «спальным» раёне Мінска працуе выстава «Прыгожая фатаграфія мяжы XIX-XX стагоддзяў. Частка 1. Непатрэбнае сваяцтва». Фотаздымкі экспазіцыі — экспанаты з прыватных калекцый Дзмітрыя Сярэбранікава і Вячаслава Яскевіча. У рэспектабельным афармленні мы бачым фотаздымкі стагадовай даўніны, апрацаваныя фотамастакамі Уладзімірам Суцягіным і Элай Шкундзіч, а таксама некалькі выкананых імі лічбавых копій.

Цікава, наколькі глыбокія тэмы здольнае ўзняць такое, здавалася б, высокатэхналагічнае матэрыялістычнае мастацтва, як фатаграфія. І тады, у першай палове XIX стагоддзя, калі Ньепс зрабіў славуты фотаздымак «выгляд з акна» пры дапамозе камеры-абскуры, і сёння фатаграфія застаецца мастацтвам, якое мае непасрэднае дачыненне да тэхнікі. (Хіба што сёння яна стала нашмат больш даступнай.) А значыць — больш прыземленым, прагматычным. У нечым, магчыма, так яно і ёсць. Але пад уздзеяннем часу старыя фотаздымкі набываюць новыя канатацыі, сэнсава трансфармуюцца ў нейкія абсалютна новыя канцэпцыі. Так і аўтары выставы «Непатрэбнае сваяцтва» нібы заклікаюць паглядзець на людзей на старых фотаздымках. Хто яны? Чаму і калі былі зроблены гэтыя фота? Толькі памятаючы сваё мінулае, «свой радавод да пятага калена», мы можам ісці наперад, ствараць будучыню... Аўтары выставы шчыра вераць, што іх рэтрафота натхняць гледачоў на глыбінныя развагі пра сваё мінулае, сваіх продкаў. Магчыма, нехта пасля прагляду вернецца дахаты, возьме сямейны альбом са старымі фотакарткамі і падумае пра нешта, пра што раней не думаў. Або раскажа сваім дзецям пра іх бабуль і дзядуляў. Чаму мы часам не беражом свае сямейныя каштоўнасці або прадаём іх за бясцэнак? Чаму не цікавімся тым, што «раньш было»? Дзіўна, але дзве фотавыставы, пра якія ідзе гаворка, хоць і абсалютна розныя, але заклікаюць да такіх сугучных рэчаў: звярнуцца да сябе, да суседа, да сваяка, да чалавека; не даць матэрыялістычнаму прагматычнаму свету паглынуць, раструшчыць нас. Можа быць, сваяцтва гэтае, повязь з мінулым, не такое ўжо і непатрэбнае?.. А людзі на чорна-белых фотаздымках не такія ўжо і незнаёмыя...

Выстава працуе да 11 снежня.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ**

■ Альбом

# «МЫ ПАДРАСЛІ...»

## Якасны запіс новага альбома «Стары Ольса» ажыццявіў на радзіме

**«Стары Ольса» нічога не запісваў цягам пяці гадоў, але за гэты час паназапасіў матэрыялу на два цэльныя па змесце альбомы — палацава-камерны і застольна-песенны. Першы дыск «Santa Maria» ўжо гатовы, а другі праходзіць этап падрыхтоўкі да запісу: «У першую чаргу, мы вырашылі запісаць рэнесанс і барока. З наступнай восені возьмемся запісаць песенную спадчыну: гэта ў асноўным застольныя і рыцарскія песні», — кажа заснавальнік і лідар гурта Зміцер Сасноўскі.**



У новы альбом увайшлі 13 твораў. Больш за палову кампазіцый узяты з вядомага зборніка барочнай музыкі «Полацкі сшытак», творы з якога трывала ўвайшлі ў партытуры польскіх і нямецкіх музыкантаў. Адна кампазіцыя запісана паводле «Віленскага сшытка» — ананімнага зборніка п'ес для сольнага і ансамблевага выканання, што быў складзены ў 1600 годзе ў Вільні. «Гэтая кампазіцыя сведчыць аб нездаволенасці аматараў музыкі ў Вялікім Княстве Літоўскім той колькасцю італьянскай музыкі, якая да нас трапляла, — тлумачыць Сасноўскі. — Так з'явіўся танец «Saltarello», аўтарам якога, верагодна, з'яўляецца віленскі кампазітар Дыямед Катон. Нашы музыканты пачыналі ўжо не проста ствараць музыку, стылізуючы яе пад французскую ці нямецкую, а і пісаць свае танцы, але пад італьянскімі назвамі».

«Звычайна мы робім новы матэрыял і выконваем яго пераважна за межамі Беларусі, а толькі потым накіроўваемся ў студыю... Я лічу, што атрымаўся добры сярэднявечны рок-н-рол. У альбоме ёсць драйв, імправізацыя, але ўсё сыграна на аўтэнтычных інструментах. Кампазіцыі яднае адно: гэта хіты эпохі Сярэднявечча і Рэнесансу Вялікага Княства Літоўскага і Заходняй Еўропы», — прыўносіць з доляй гумару сучасную лексіку лютніст гурта Ілья Кубліцкі. «Падчас фестываляў мы часта выклікаем здзіўленне знаўцаў і даследчыкаў. Так адбываецца таму, што склаўся стэрэатып, што музыку барока трэба выконваць на класічных інструментах. Таму, можна сказаць, мы з'яўляемся вальнадумцамі ў гэтай сферы, не прымаем каноны, якія сфарміраваліся дзякуючы акадэмічнаму музычнаму выхаванню. Растлумачыць выраз «сярэднявечны рок-н-рол» можна ў тым сэнсе, што мы можам называць сябе рэвалюцыянерамі ў сферы вяртання ў канцэртную практыку аўтэнтычных інструментаў, уласцівых менавіта той эпосе», — развівае думку Кубліцкага Сасноўскі.

Аказваецца, зараз і ў мінскіх «спальніках» можна запісацца на міжнародным узроўні. Цікава, што гуказапісвальная студыя, на якой калісьці пачынаўся запіс, згарэла і ўжо не існуе, таму ў выніку «Santa Maria» запісалася на Sunflowers. Гэта студыя знаходзіцца ў даволі спецыфічным мінскім раёне Шабаны, які ніколі не меў культурнай славы (прапанова перайменаваць Sunflowers у Sabanyflowers выклікала смех).

Прафесійным падыходам да справы гукарэжысёра Віталя Кулеўскага музыканты не стамляюцца шчыра захапляцца. Паводле іх слоў, шмат у чым дзякуючы яго руплівасці пры працы з гукам «Santa Maria» стаў самым якасным па гучанні альбомам за ўсю немалую дыскаграфію групы. Да таго ж «Santa Maria» адрозніваецца ад папярэдніх запісаў «Старога Ольсы» тым, што альбом цалкам спрадзюсаваны музыкантамі самастойна. «Гэта першы альбом, які мы зрабілі без прадзюсараў і спонсараў і на які ўплывалі толькі нашы асабістыя эстэтычныя, навуковыя, даследчыя погляды. Мы запісалі яго самастойна ў фінансавым сэнсе, і, адпаведна, не мелі абавязкі прыслухоўвацца да думак іншых людзей. Мы крыху «падраслі» ў сэнсе тэхнічнага выканання, навуковага даследавання, паглыблення ў традыцыі XVI-XVII стагоддзяў», — падсумоўвае Зміцер Сасноўскі.

На фоне ўсіх твораў у новым альбоме вылучаюцца і дзве песні, адна з якіх дала назву дыску. Гэта не вельмі характэрныя для нашага рэпертуару творы. За 14 гадоў існавання гурта ў нас было ўсяго толькі дзве рэлігійныя песні: гімн «Багародзіца» і псальма «Монаршэ Вечнэму», адпаведна, XV і XVI стагоддзяў. У новы альбом трапілі яшчэ дзве песні духоўнага зместу: «Ave Maria» і «Santa Maria», — дадае Зміцер Сасноўскі, які выступіў пры падрыхтоўцы альбома не толькі як выканаўца, але і перакладчык. Напрыклад, музыка і словы да песні «Ave Maria» былі знойдзены ў рукапісе XIV стагоддзя «Llibre Vermell de Montserrat» (што ў перакладзе з каталонскага азначае «Чырвоная кніга манастыра Мансерат»). Згодна з каментарам складальніка рукапісу, гэтую песню можна выконваць пілігрымам, якія спыніліся ў кляштары і маюць ахвоту спяваць і танцаваць.

Любая музыка патрабуе прывыкання, выхавання. Напрыклад, рок-музыка існуе ўжо больш за 60 гадоў, і за гэты час яна выхавала масавага слухача. Класічная музыка таксама існуе вельмі даўно, і, адпаведна, яна таксама выхавала свайго слухача. А сярэднявечная музыка ў канцэртнай практыцы прысутнічае толькі гадоў 15-20, таму яна, нягледзячы на свой узрост, будзе выхоўваць сабе аўдыторыю яшчэ не адно дзесяцігоддзе, упэўнены «стараольсаўцы».

І той факт, што гэта другая — пасля «Песняроў» — група ў гісторыі Беларусі, чые беларускамоўныя кампазіцыі вучаць ды саматужна перакладаюць на рускую мову на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі тамашнія шараговыя слухачы, дае падставы спадзявацца на далейшы рух наперад выдатнага калектыву.

**Зміцер СНАПКОЎСКІ**

Анатоль РАЗАНОВІЧ:

# «І Ў АСАБІСТЫМ ЖЫЦЦІ, І Ў АГУЛЬНЫМ ЛЁСЕ ВІНАВАТЫЯ ЎСЕ»

**— Першае і адно з самых, напэўна, моцных уражанняў пры чытанні вашай новай кнігі «Пустэльнік» («Отшельник». Выдавецтва Беларускага Экзархата Маскоўскага Патрыярхата) — прырода. Без усялякага перабольшання можна сказаць, што прырода тут — адна з галоўных дзеючых асоб. Аўтара можна нават западозрыць у жаданні ўраўнаваць чалавека, свайго героя, і прыроду. Міжволі ўзнікае пытанне: што вы гэтым хацелі сказаць?**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Анатоль Іванавіч Разановіч нарадзіўся на Брэстчыне. Выпускнік факультэта журналістыкі БДУ і Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Аўтар некалькіх кніг, у тым ліку «Варшаўскі экспрэс», «Палын-вада», «Спасціжэнне ісціны», «Свет імгненняў».**

— Чалавек — частка прыроды, гэта агульнавядома. Як вядома і тое, што чалавек — істота разумная. І яго розум павінен служыць не толькі ўласна носьбіту, але і ўсяму таму, што акружае чалавека, што прыносіць яму карысць, дае разуменне сутнасці разнастайнага і шматбаковага свету. Ці можна ў такім выпадку ставіцца да тых жа «братоў нашых меншых» абыякава? Не. Менавіта таму ўпамінанне аб Усявышнім — гэта ваша ўнутраная згода з важнасцю і неабходнасцю цэласнасці прыроды, яе багаццем. А самае галоўнае — з непаўторнасцю жыцця, якое дадзена нам і ў якім чалавек без прыроды не можа існаваць. Гэта і ёсць наша Радзіма. Усе астатняе — мяжа, дзяржаўнасць, грошы — часовае. Яно, безумоўна, важнае і неабходнае, але на пэўным этапе развіцця чалавецтва. Прыйдзе час, і ў зямлян будзе адзіны ўрад. Адзін на ўсіх. Як і прырода, Бог, мы самі. Доказ гэтаму — глабалізацыя.

**— Ці існуе нейкая асаблівая місія пісьменніка — як выхавацеля свайго чытача, яго «духоўніка», а ў нечым нават трохі прарока? Ці можа пісьменнік быць індыферэнтным прафесіяналам, для якога галоўнае — ліха закруціць сюжэт і вырашыць калізію з дапамогай набору выяўленчых сродкаў?**

— Місія ў любога чалавека адна — жыць у гармоніі з навакольным светам, падпарадкоўвацца яго законам. Кожны чалавек робіць сваю справу. Хтосьці апрацоўвае зямлю, хтосьці будуе дамы, а хтосьці піша. Але кожны ў сваёй справе павінен быць прафесіяналам. Гэта мая пазіцыя. Усё, што непрафесіянальна,— брак. А пісьменнік не мае права халтурыць, ён піша для вечнасці. Гэта высокія словы, але ў гэтым выпадку яны апраўданыя. Таму што пісаць не для вечнасці — значыць «страчыць» раманы на патрэбу дня. У такім выпадку які ж ты пісьменнік? Ты рамеснік і проста зарабляеш грошы. Я гэта кажу не таму, што творчы чалавек павінен быць галодным, не. А таму, што слова — гэта ў першую чаргу заклік, зварот, выражэнне думак. Асновай іх павінна быць дабро. А яно заклікана выхоўваць, быць духоўным праваднікам, весці да святла. Гэта тыя асаблівасці пісьменніцкай працы, без якіх пішучы чалавек можа стаць толькі літаратарам. Не больш. Ён можа закруціць сюжэт, больш-менш ахарактарызаваць герояў у сваім творы, але пры гэтым быць незразумелым для чытачоў. Тады для чаго пісаў?..

**— Як вы адносіцеся да ненарматыўнай лексікі ў літаратурным творы? Некаторыя расійскія (і не толькі) пісьменнікі дазваляюць сабе такую вольнасць. І калі Дума Расіі асудзіла (нават заканадаўча забараніла) такі моўны бруд у СМІ, то наконт літаратуры, тэатра, кіно дэпутаты ніяк не выказаліся…**

— Ненарматыўная лексіка — гэта творчае бяссілле пішучага чалавека. Не пісьменніка і нават не рамесніка. Ніводны аўтар, які паважае сябе і сваіх чытачоў, не дазволіць сабе ў сваім творы ненарматыўную лексіку. Калі яна ёсць, то гэта не творца. Гэта п'яная балбатня дрэнна выхаванага і непрыемнага чалавека, які выдае «на-гара» абяздушаныя словы. А калі ў гэтых словах няма душы, то і няма ў іх толку, неабходнасці, адсутнічае дабро. Значыць, з чытачом размаўляе не разумны чалавек, а нейкая істота, якая прысвоіла сабе права зневажаць людзей. Другога азначэння такім «творцам» ў мяне няма.

**— Пісьменнікі старэйшага пакалення, якіх зараз заслужана называюць класікамі (той жа Васіль Быкаў, а ў расіян — скажам, Валянцін Распуцін), прызвычаілі нас, чытачоў, да думкі, што вайна была розная, а зачастую — у кожнага свая. І такая вось недарэчная і працяглая — таксама, як у вашага героя, — з нечаканым заданнем вартаваць царкоўныя каштоўнасці. Але ў яго была яшчэ адна вайна — з самім сабой, якую ён падчыстую прайграў... Вам цікава было даследаваць характар, учынкі, гісторыю чалавека з нізкім парогам маральнасці? Ці за гэтым стаіць простая жыццёвая праўда, ад якой нікуды не дзенешся?**

— Сапраўды, у кожнага свая вайна. І ў майго героя Сцяпана Лосіча ў рамане «Пустэльнік» — таксама свая. Яна пераходзіць у вайну з самім сабой. Гэта натуральна і зразумела. У кожнага з нас унутры ідзе такая вайна — мы пражываем сваё жыццё ў сумненнях: ці правільна я раблю, кажу, імкнуся да нейкай мэты?.. І гэтак далей. Гэта пытанні да сябе. Гэта барацьба дабра і зла ў чалавеку. Гэта класічны закон адзінства і барацьбы супрацьлегласцяў. Гэта духоўная праца і нават проста фізічныя працэсы. Памятаеце: «Я червь, я Бог...»? Невыпадкова Лосіч ператварыўся з вартаўніка каштоўнасцяў у прамую супрацьлегласць. Але такім яго зрабіла жыццё, а дакладней — людзі, для якіх маральныя каштоўнасці былі пустым гукам, не пачутым голасам у іх цёмных душах. Не нізкі парог маральнасці ў майго героя, а парог безвыходнасці, непатрэбнасці яго новай уладзе як працаўніка, грамадзяніна, чалавека. І ўсё ж ён застаўся грамадзянінам, чалавекам, таму што аддаў гэтыя каштоўнасці, зразумеўшы з цягам часу самае галоўнае: праўду не схаваеш. Праўда — вечная, а няпраўда — часовая, яна жыве мала, а памірае ў муках. Пры гэтым мучыць і тых, хто жыве з няпраўдай. Не, не прайграў Лосіч вайну з сабою, а ў рэшце рэшт выйграў.

**— Дарэчы, гэтая гісторыя мае рэальную аснову. Як журналіст вы пра яе расказвалі тры дзесяцігоддзі таму чытачам Брэстчыны і нават ва ўсесаюзным друку…**

— Не я адзін пра гэта расказваў. Справа нават не ў гэтым. Важна, што мы павінны ведаць сваю гісторыю. А гісторыя — гэта людзі. Якія людзі — такая і гісторыя. За ўсё даводзіцца плаціць, бо як у асабістым жыцці, так і ў агульным лёсе вінаватыя ўсе. Хто больш, хто менш, але ўсе. У маім рамане «Пустэльнік» гэта падкрэсліваецца даволі выразна.

**— Ваш герой — не вельмі вялікі прыхільнік савецкай улады, чаму ёсць сваё тлумачэнне: ён з моцнай сялянскай сям'і, што была рэпрэсіравана як «кулацкі элемент». Хаця і не вялікі вораг. Ва ўсякім разе, на супрацоўніцтва з акупантамі ён усвядомлена не пайшоў. Але, як мне падалося, вобраз гэтага чалавека, гісторыю якога аўтар прасочвае на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў, не даецца ў развіцці... Такая «закансерваванасць» героя — гэта аўтарскі ход? Вы не бачыце для яго хоць нейкай магчымасці пачаць жыць па-новаму? ЖЫЦЬ, а не існаваць? Бо тысячы сем'яў рэпрэсіраваных працягвалі жыць, і ў кожнага жыццё было па-свойму цікавым…**

— Тут я з вамі не згодны. Мой герой вырас духоўна. Ён навучыўся разумець прыроду, сябе, нават сваіх ворагаў. Ён папрасіў прабачэння і адышоў у іншы свет з лёгкім сэрцам. Яго ўнутраная барацьба прывяла да разумення неабходнасці дабра, вечнасці Бога, яго запаведзяў: не забі, не ўкрадзі, не пажадай чужога… Усё жыццё Лосіча — гэта шлях да зразумення ісціны ў яе прамым сэнсе. Невыпадкова мой раман «Пустэльнік» выдадзены выдавецтвам Беларускага Экзархата Маскоўскага Патрыярхата, за што я ўдзячны. Мой герой выходзіць з лесу ўжо старым чалавекам. У якой брыгадзе ён можа працаваць? Якія такія тысячы сем'яў рэпрэсіраваных працягвалі нармальна жыць? І ў кожнага жыццё было па-свойму цікавым? Успомнім Дастаеўскага, яго «слязу дзіцяці». Ці ж вартая яна нейкай міфічнай «светлай будучыні»? Так, людзі рабілі выгляд, што жывуць добра, што лепшай улады, чым сталінская, яны не ведаюць. Але гэта ўсё было паказное, ненатуральнае. Маці загінулых у «класавай барацьбе» дзяцей плакалі ў падушкі, дзеці забітых у гэтай самай барацьбе бацькоў праклінналі забойцаў, якія займалі ў тыя часы вельмі высокія пасады. Мы ўсе аб гэтых часах пачалі даведвацца толькі ў гады перабудовы. Гэта быў агульны шок, асабліва для маіх равеснікаў, калег, якія ў большасці сваёй былі партыйнымі. І гэтыя пачуцці я часткова паказваю ў рамане «Палын-вада», два тамы якога выйшлі ў выдавецтве «Мастацкая літаратура». Выйшлі дзякуючы кіраўніцтву выдавецтва і Міністэрства інфармацыі. А калі гэтыя творы выйшлі, то, значыць, мы разумеем, што так жыць далей было нельга. Савецкі Саюз — а гэта, безумоўна, вялікая дзяржава — распаўся. Чаму? Таму што было занадта шмат няпраўды. І гэтую няпраўду людзям у галовы ўбівалі як праўду. Вось і ўвесь адказ тым, хто ўсю віну за развал былой дзяржавы ўзвальвае на так званы Захад. Не Захад вінаваты, а мы самі.

**— Як вы лічыце, у сучаснай беларускай літаратуры ёсць эпахальныя творы? Якія падзеі — а на іх гісторыя нашага народа была багатая — маглі б прыцягнуць увагу раманіста ў першую чаргу?**

— У нас нямала па-сапраўднаму таленавітых пісьменнікаў і паэтаў. Гэта Віктар Гардзей, Уладзімір Глушакоў, Міхась Башлакоў і іншыя. Але эпахальных твораў, якія характарызуюць наш час, пакуль няма. Па-першае, таму, што самае эпахальнае — гэта час перабудовы і гады пасля яе. Думаю, што такія творы зараз пішуцца і вельмі хутка ўбачаць свет. Мы з вамі будзем сведкамі выхаду многіх кніг, якія стануць мастацкімі дакументамі нашай навейшай гісторыі — складанай, непрадказальнай, жорсткай, багатай на падзеі і канфлікты.

**— Прынята пытацца, што на рабочым стале пісьменніка?**

— На маім рабочым стале некалькі старых твораў, якія трэба паправіць, дапісаць, адрэдагаваць. Разам з тым, мяне захапіла тэма беларускай эміграцыі. Я хачу паказаць яе знутры. Дзякуй Богу, мне знаёмы многія людзі, мае суайчыннікі, якія жывуць за межамі нашай краіны, нават за межамі СНД. Я бываю ў іх, а яны — у мяне. У гэтых людзей сваё жыццё. Але ў ім заўсёды прысутнічае Радзіма. Вялікая, а найчасцей малая. Мой першы раман на гэтую тэму — «Джокер». Чытачы, калі гэты і іншыя творы ўбачаць свет, пазнаёмяцца не толькі з героямі раманаў, але і стануць удзельнікамі прыгод, дэтэктыўных гісторый, складаных па сваім псіхалагічным напаўненні падзей. Не выдуманых, а сапраўдных. Дарэчы, у маіх творах мала выдумкі. Усе яны, як і «Пустэльнік», будуюцца на рэальнай аснове.

**— Бытуе думка, што чытачоў у кніг год ад года становіцца менш і праца пісьменніка ў бліжэйшым будучым можа застацца незапатрабаванай.**

— Гэта не так. Працэнт людзей, якія чытаюць кнігі, практычна не мяняецца ўжо некалькі стагоддзяў. Мастацкія творы, у якіх паказваецца і асэнсоўваецца жыццё, неабходны чалавеку як паветра ці ежа. Людзі не могуць жыць без слова. Яно дадзена нам звыш. У ім наша ўратаванне, наша вера, наша далейшае жыццё. Выдайце раман, які можна будзе параўнаць з «Ціхім Донам» Міхаіла Шолахова, «Майстрам і Маргарытай» Міхаіла Булгакава, ваеннай прозай Васіля Быкава, і тады вы ўбачыце чэргі ў кніжных магазінах.

**Гутарыў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.**

■ Падзея

## АРМІЯ ГЛЯДЗІЦЬ У ЗАЎТРА

**Больш за 300 дэлегатаў сабралася ў беларускай сталіцы падчас IX з'езда Беларускага саюза афіцэраў. Абмяркоўваліся вынікі работы грамадскага аб'яднання, вызначыліся з далейшымі перспектывамі, выбралі кіруючыя органы.**



Фота БЕЛТА.

— Вырашаліся і пытанні паўсядзённага жыцця: працаўладкаванне афіцэраў запасу і членаў саюза, іх пенсійнае забеспячэнне, жыллёвыя праблемы, санаторна-курортнае аздараўленне, дапамога адзінокім, увекавечванне памяці тых, хто пайшоў з жыцця,— зазначыў **старшыня Беларускага саюза афіцэраў, генерал-лейтэнант Яўген МІКУЛЬЧЫК.** — Таксама абмяркавалі планы нашай дзейнасці, звязаныя з 70-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і юбілеем Перамогі. Мы павінны дапамагаць дзяржаве вырашаць ваенна-патрыятычныя і ідэалагічныя задачы. Мы імкнёмся не адставаць ад тых працэсаў, якія адбываюцца. І гэтыя даты — не выключэнне.

Больш чым за два дзесяцігоддзі работы Беларускі саюз афіцэраў стаў адной з найбольш буйных і аўтарытэтных грамадскіх арганізацый краіны. У яе складзе — 7 абласных, 15 гарадскіх і 132 раённых саветаў, 274 першасных арганізацый, арганізацый Узброеных Сіл, родаў войск і структурных падраздзяленняў Міністэрства абароны. Усяго больш за 25 тысяч чалавек!

Прадстаўнікі з розных рэгіёнаў краіны мелі магчымасць ацаніць працу сваіх калег, падзяліцца асабістым вопытам. **Ваенны камісар Магілёўскай вобласці, палкоўнік Аляксандр ГАРОШКІН** расказаў аб узаемадзеянні абласной арганізацыі Беларускага саюза афіцэраў з насельніцтвам:

— Асабліва гэта актуальна для нашай вобласці, дзе колькасць воінскіх часцей вельмі невялікая. І для таго, каб нам выхоўваць моладзь у ваенна-патрыятычным духу і прывіваць ёй любоў да Радзімы, трэба з чагосьці падсілкоўвацца. У гэтым нам дапамагаюць нашы вайскоўцы, ветэраны. Яны пастаянна прысутнічаюць на ўсіх мерапрыемствах, якія ў нас адбываюцца: і падчас адпраўкі ва ўрачыстых абставінах прызыўнікоў у армію, і на сустрэчах у навучальных установах. Яны расказваюць аб мінулым узброеных сіл, аб тым, чым армія жыве сёння. У сваю чаргу, у нас наладжана адрасная дапамога ветэранам. Нягледзячы на тое, што наша арганізацыя не шматколькасная, яна выдатна выконвае ўсе задачы, якія ставяцца перад ёй. І ёсць станоўчыя вынікі. Напрыклад, падчас прызыўных кампаній працуюць незалежныя псіхолагі, якія праводзяць апытанне сярод юнакоў. Згодна з данымі мінулай прызыўной кампаніі, жаданне служыць у арміі выказалі 87% магіляўчан. Чым не вынік добрага ўзаемадзеяння?

Гэта гаворыць аб тым, што сёння як ніколі важна выхоўваць моладзь у дзяржаўна-патрыятычным кірунку. І вядучая роля ў гэтым належыць Беларускаму саюзу афіцэраў.

**Вераніка КАНЮТА**

■

## Падарунак ад Дзядулі

### Ёсць варыянты і зніжкі

**Ну хто з малых (ці нават вялікіх) пад Новы год не хацеў бы пачуць вясёлае «Табе падарунак!.. Ад Дзеда Мароза!».**

Ён, традыцыйны, ад РУП «Белпошта», як ужо паведамлялася, прапануецца сёлета ў чатырох варыянтах — на любы, так бы мовіць, кашалёк і густ... Можна, напрыклад, абмежавацца лістом ад любімага казачнага персанажа — з добрымі пажаданнямі, у адмысловым канверце... Можна дапоўніць яго вельмі дарэчнымі перад святам наборамі шакаладных цукерак, навагодніх упрыгажэнняў «Зрабі сам»... Ды і гатовы конік — мяккая цацка-бірулька, сімвал 2014 года, прыйдзецца даспадобы таксама.

Аформіць дастаўку арыгінальна аформленых віншаванняў можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі. Кошт у залежнасці ад выбраных варыянтаў складзе ад 45 да 195 тысяч беларускіх рублёў за межы Беларусі і ад 25 да 125 тысяч беларускіх рублёў у межах. Аднак гэта калі замаўляць віншаванне **пасля 30 лістапада.** А да гэтай даты ўсім сваім кліентам у рамках святкавання Сусветнага дня дзіцяці РУП «Белпошта» прапануе зніжку ў 20 працэнтаў. Ёсць сэнс скарыстацца.

**Валянціна ДОЎНАР**

*Усевалад Іванавіч КУПРЭВІЧ!*

*Сёння ў цябе — юбілей, цудоўнае свята ў жыцці. З гэтай нагоды прымі самыя сардэчныя віншаванні і самыя шчырыя пажаданні выдатнага настрою, душэўнага цяпла, шчасця, дабрабыту, доўгіх гадоў жыцця.*

*Няхай будзе добрым здароўе,*
*Светлым будзе твой*
*кожны дзень,*
*Каб з такім жа*
*цудоўным настроем*
*Сустрэць чарговы юбілей.*

***Жонка.***

Утерянные полисы страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БА № 0476028 и № 0476063 **считать недействительными.**

УНН 190961134

Страховые полисы BY/03/7688267 и BY/03/6126703 **прошу считать недействительными в связи с утерей.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ в г. Бресте

| № лота | Адрес участка/ кадастровый номер | Кадастровый номер 14010000000 | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Срок аренды, лет | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расх. по подг. земел.- кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Рябиновая (№ 32 по ГП) | 1028116 | 0,1116 | строительство и обслуживание продовольственного магазина | 10 | **123 194 682** | 24 630 000 | 6 615 444 | 0,0232 га – охранная зона линии связи; 0,0512 га – охранная зона сетей канализации |
| 2 | ул. Красногвардейская | 1028118 | 0,0096 | строительство и обслуживание объекта по изготовлению и обработке металлоизделий | 10 | **3 737 166** | 740 000 | 6 405 287 | 0,0007 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В |
| 3 | в районе пересеч. ул. 17 Сентября и пр-та Машерова | 1028110 | 0,0635 | установка и обслуживание объекта летней торговли | 10 | **122 017 288** | 24 400 000 | 6 405 287 | ограничений в использовании земель нет |
| 4 | ул. Московская, 123 | 1028117 | 0,1950 | строительство и обслуживание спортивного объекта (теннисные корты) | 10 | **241 826 598** | 48 350 000 | 6 405 287 | 0,1949 га – водоохранная зона р. Мухавец |
| 5 | ул. Суворова | 1028106 | 7,2726 | строительство и обслуживание многоквартирных (этажностью до 5 этажей), блокированных и одноквартирных жилых домов | 10 | **3 218 822 579** | 643 760 000 | 7 608 920 | 0,0367 га – охранная зона подземной линии электропередачи напряжением до 1000 В; 0,0342 га – охранная зона подземной линии электропередачи напряжением свыше 1000 В; 0,4329 га охранная зона сетей канализации |
| 6* | ул. Героев обороны Брестской крепости, 3/1 | 1027944 | 0,0801 | строительство и обслуживание станции технического обслуживания автомобилей с объектом торговли автозапчастями | 10 | **80 129 755** | 16 020 000 | 6 121 444 | 0,0082 га – водоохранная зона реки Мухавец; 0,0801 га – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения; 0,0368 га – охранная зона сетей и сооружений канализации; 0,0005 га – охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения |
| 7* | между ул. Октябрьской Революции и ул. 28 Июля | 1020990 | 3,5375 | строительство и обслуживание объекта торгово-развлекательного назначения, административного назначения, гостиницы с условиями создания на прилегающей территории ландшафтно-рекреационной зоны | 10 | **3 150 636 580** | 630 120 000 | 3 143 097 | ограничений в использовании земель нет |
| 8* | ул. Воинов-интернационалистов, 19 | 1019530 | 0,0673 | строительство и обслуживание объектов социально-бытового назначения, торговли и общественного питания | 10 | **67 873 444** | 13 570 000 | 5 795 970 | 0,0117 га – охранная зона газопровода среднего давления |
| 9* | ул. 2-я Белорусская | 1019335 | 0,8704 | строительство и обслуживание объекта производственного назначения | 10 | **355 798 999** | 71 150 000 | 1 450 817 | 0,1041 га – охранная зона канализационного коллектора; 0,0208 га – охранная зона газопровода среднего давления |
| 10* | ул. Высоковская | 1027693 | 0,4733 | строительство и обслуживание объекта питания с общественно-бытовыми помещениями | 10 | **489 736 127** | 97 940 000 | 5 941 339 | ограничений в использовании земель нет |
| 11* | № 6 (по ГП) согласно ПДП «Вычулки-Ямно» | 1027196 | 0,0748 | строительство и обслуживание объекта торговли и общественного питания | 10 | **26 452 586** | 5 290 000 | 2 627 392 | ограничений в использовании земель нет |
| 12* | в районе ул. Волгоградская | 1025064 | 0,2967 | строительство и обслуживание спортивных сооружений | 10 | **244 827 880** | 48 960 000 | 1 306 845 | ограничений в использовании земель нет |
| 13* | ул. М.Л. Мошенского | 1025787 | 0,9446 | строительство и обслуживание автостоянки | 10 | **692 858 755** | 138 570 000 | 1 513 733 | 0,0060 га – охранная зона газопровода среднего давления |
| 14* | ул. Базановой, 4 | 1026802 | 0,0187 | установка и обслуживание объекта торговли | 10 | **29 635 375** | 5 920 000 | 1 407 198 | 0,0032 га – охранная зона воздушной линии электропередачи напряжением до 1000 В; 0,0056 га – охранная зона водопровода |
| 15* | ул. Красногвардейская | 1026816 | 0,0035 | строительство и обслуживание объекта социального назначения № 1 | 10 | **2 154 645** | 430 000 | 1 529 617 | 0,0002 га охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В |
| 16* | ул. Красногвардейская | 1026817 | 0,0035 | строительство и обслуживание объекта социального назначения № 2 | 10 | **2 154 645** | 430 000 | 1 001 905 | 0,0021 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В |
| 17* | ул. Красногвардейская | 1026818 | 0,0035 | строительство и обслуживание объекта социального назначения № 3 | 10 | **2 154 645** | 430 000 | 1 001 905 | ограничений в использовании земель нет |

** – повторные аукционные торги*

**Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»**

**Аукцион проводится в соответствии Положением о порядке проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462, и состоится при наличии не менее двух участников.**

**Перечень документов, представляемый участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; **индивидуальным предпринимателем** – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; **представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; **представителем иностранного гражданина** – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором аукционных торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Порядок осмотра предмета аукциона (лота) осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Задаток в размере до 20% от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924.**

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан:**

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов, осуществить оплату за предмет аукциона, возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка, а также компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников). Оплата цены продажи предмета аукциона может быть осуществлена в рассрочку, в соответствии с решением Брестского горисполкома от 15 мая 2008 г. № 881;

• в течение 2 рабочих дней после перечисления платежей заключить с Брестским горисполкомом договор аренды земельного участка;

• в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка обратиться за государственной регистрацией договора аренды участка, а также прав на него;

• приступить к занятию земельного участка (начать строительство, иное освоение земельного участка) в течение 6 месяцев (для юридического лица, индивидуального предпринимателя) и в течение 1 года (для граждан) со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство капитального строения (здания, сооружения).

**Аукцион состоится 27 декабря 2013 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**

**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 25.11.2013 г. до 17.30 20.12.2013 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**

**Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65.**

**Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www.gki.gov.by.**

## ОАО «Технолит Полоцк»

**ИЗВЕЩАЕТ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ 24 декабря 2013 г. в 12.00 ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ по адресу: г. Полоцк, ул. Октябрьская, 47 (актовый зал ОАО «Технолит Полоцк»)**

**Повестка дня внеочередного общего собрания акционеров:**

1. О внесении изменений и дополнений в устав общества.
2. Об избрании членов наблюдательного совета, его составе.
3. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета.

С материалами по вопросам повестки дня собрания акционеры могут ознакомиться по адресу: г. Полоцк, ул. Октябрьская, 47 (кабинет председателя НС) в рабочие дни (понедельник – пятница), начиная с 13 декабря 2013 г. с 9.00 до 16.00.

Регистрация участников собрания будет производиться с 10.00 до 11.45 в день и по месту проведения собрания на основании: акционер – паспорт; представитель – паспорт и доверенность, оформленная в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 30 августа 2006 г. № 1093 «Об утверждении Инструкции о порядке регистрации доверенностей, предусматривающих передачу прав, удостоверенных акциями».

Список акционеров Общества, имеющих право на участие в собрании, составлен на основании данных реестра акционеров по состоянию на **10 декабря 2013 г.**

*Наблюдательный совет ОАО «Технолит Полоцк».*

УНП 300083521

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Универмаг «Солигорск» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом недвижимого имущества в составе:**

• **здание склада,** **общей площадью 846,6 кв.м (инв. № 644/С-3267);**

• **ограждение железобетонное** **(инв. № 2Б по бух. учету).**

Указанное имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 625000000012000035, площадью 0,1888 га (предоставлен на праве постоянного пользования), по адресу: Минская область, район станции «Калий-1».

**Начальная цена с НДС – 1 471 052 400 бел. руб. Задаток, 10% от начальной цены (147 106 000 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 5 (пяти) рабочих дней после подписания договора купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **24.12.2013 г. в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 23.12.2013 г. до 16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Столбцовское РКБО» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже**

**комплексного приемного пункта**

**общей площадью 234,1 кв.м (инв. № 622/С-41345)**, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625483903601000507 площадью 0,1161 га (предоставлен на праве аренды) по адресу: **Минская область, Столбцовский район, Миколаевщинский с/с, д. Миколаевщина.**

Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона водных объектов на площади 0,1161 га.

Указанное недвижимое имущество сдается в аренду (сведения об арендаторах можно получить у продавца и организатора аукциона).

**Начальная цена с НДС – 193 843 200 бел. руб.**

**Задаток 10% от начальной цены (19 385 000 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней после подписания договора купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **24.12.2013 г. в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.12.2013 г. до 16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.**

Усё пра Еву

■ Нататнік Яго жонкі

Святлана ДЗЯНІСАВА,
галоўны рэдактар часопіса «Маладосць»

# НАСТАЛЬГІЧНАЕ



Я ведаю: усяму прычынай — восень. Гэты слотны настройчык — яе, плаксіўкі, мокрых рук справа.

Увосень, між іншым, са мной здараецца ўсё самае лёсавызначальнае, таму пакорна штогод трываю і дождж, і туман, і слоту: прарвёмся!

Журналісткай, як памятаю, я стала (ці пачала станавіцца — так, відаць, больш правільна) менавіта ўвосень. І ў поўным сэнсе ад няма чаго рабіць.

— Пішаш? Ну, пішы, пішы, — сказаў Ён без аніякага энтузіязму, калі я, паклаўшы дзяцей спаць, выводзіла слова за словам пад гукі стогнаў і ўдараў Яго любімага баевіка... Чакайце, што ж гэта тады ішло? Ага, успомніла: пад «Die Hard 2» добра пісаўся «Трактат пра ляноту»! Чым бы хто з нас ні цешыўся, што называецца... Ну не мог жа Ён тады ведаць, што так вось, за сталом на кухні, у тапках на босую нагу пракладаецца шлях не толькі ў нейкую там глянцавую журналістыку, але і ў прэсу ўвогуле. Што за кубкам гарачага малака (ці што я там тады піла?) з разынкамі (абавязкова з разынкамі!) нараджаюцца... рэдактары. Што неяк — бывае! — само ўсё ўтвараецца.

...Я таксама тады не бачыла скрозь паперу. Не ўмею глядзець скрозь яе і цяпер. Але нешта прыводзіла ў рух маю правую руку, а ў ёй — ручку. І на паперу кладаліся радкі. Перакрэсліваліся — і пісаліся новыя. Зноў перакрэсліваліся, зноў пісаліся. Ну не ведаю я, як можна сесці — і быццам з кулямёта: пісаць-пісаць-пісаць, амаль без правак. Бо і ў новых, ужо, здавалася б, больш удалых, радках увесь час нешта перастаўляецца з месца на месца.

Дарэчы, пра кулямёт. Дакладней — пра кулі. Яны, як вядома, з таго ж металу, што і тыпаграфскі шрыфт. Заўважана не мною, але мною ўзважана: са словам — асцярожна, як са зброяй. Увогуле, люблю сэнсавыя сімвалы...

...Ці не восенню і яны прыдумляліся — парачка чырвоных баговак (багоўка па-англійску — «птушка-панна», ladybird) — як сімвал выдання для жанчын, з аднаго боку, а з другога — як сімвал бясконцасці, гэтага выдання, а таксама водгукаў на яго, тыражоў... І зноў жа — прыдумваліся ад няма чаго рабіць. У «Косма», маўляў, ёсць маска коткі — ёю, абаяльнай і запамінальнай, завяршаецца кожны артыкул. А мы, маўляў, не «Косма», мы круцей! Так у часопісе «ЖЖ», у якім мяне пасля пяці гадоў фрылансерства папрасілі працаваць рэдактарам, замест двух «Ж» напрыканцы кожнага артыкула з'явіліся багоўкі. Яны і цяпер там стаяць — шматабяцальныя крылатыя шматкроп'і. А пра сябе я і цяпер, бывае, чую: «Маці «ЖЖ»-шных баговак». У лістападзе «ЖЖ» спаўняецца чатырнаццаць. Пераходны ўзрост!

...А аднойчы, і таксама ўвосень, выказала ў думках пажаданне атрымаць на дзень нараджэння новую працу. Як новую сукенку, бо са старой ужо вырасла. Я не ведаю, колькі часу ідзе на адпраўку жадання Туды і ў якія тэрміны яно Там разглядаецца, але прапанову стаць рэдактарам «Маладосці» атрымала праз тыдзень пасля заканчэння восені і за тры тыдні да дня нараджэння.

... І Яго, свайго мужа, я сустрэла таксама ўвосень і таксама ў лістападзе. Амаль чвэрць стагоддзя таму, на Яго дзень нараджэння.

— А колькі ты хочаш дзяцей? — спытаў Ён літаральна на першым спатканні. Смешны...

*Ты помнишь ли вечернюю Немигу?*
*Пушистый снег спускался на ресницы...*
*Мы словно начинали нашу книгу —*
*Мы открывали первую страницу».*

Так я запісала пазней у свой сшытак. Наіўная — хацела быць паэткай. Тады Ён яшчэ не сказаў мне: «Ох, намучышся». А так, між іншым, і здарылася. Між іншым, бо гэтае іншае — спрэс жыццё, шчаслівае і багатае. Багатае, як восень на дажджы, туманы, слоту і павуціннё, на розныя ідэі і падзеі. Без Яго яно такім не было б, гэта дакладна.

— Зноў ты прыбралася ў майку з джынсамі? Для галоўрэда — несалідна, — гэта мне кажа Ён, мой іміджмейкер.

— Пірог занясі ў рэдакцыю — там абавязкова ацэняць! — кідае Ён жа, калі мае чарговыя кулінарныя фантазіі зашкальваюць.

— Ты ж сам казаў: «Ну-ну, пішы-пішы», — жартую я, калі ў гуморы.

— Я проста ведаю цябе. Ты... Ты пішы.

А раней я пляла карункі. Нядрэнны, дарэчы, занятак для маці траіх дзяцей.

❒❒❒

І з днём нараджэння, любы!

■ Правільны разлік?

# ВЫЙСЦІ ЗАМУЖ ЗА... СТАЛІЦУ

**Многія дзяўчаты з правінцыі мараць выйсці замуж за мінчаніна, мяркуючы, што гэта адразу вырашыць шэраг праблем. Але часта бывае наадварот: складанасцяў становіцца толькі больш...**

## Мары збываюцца...

Калі Марына пазнаёмілася з Алесем, той быў яшчэ жанаты, але з жонкай не жыў. І ўжо праз паўгода дзяўчына здолела не толькі развесці яго з другой «паловай», але і ажаніць з сабой. Яе хуткацечнае каханне і такі ж паспешлівы шлюб выклікалі зайздрасць ва ўсіх сябровак.

«Гэта ж трэба — адхапіць такога хлопца, — сказала ёй Ганна на вяселлі, — і мінчанін, і трохпакаёвая кватэра, і пры грошах. Будзеш там у сталіцы хадзіць па буціках і рэстаранах!».

Марына і сама цудоўна разумела, што ёй пашчасціла. Бо Алесь яшчэ і па характары быў добры. «Вось дурніца яго першая жонка, — думала дзяўчына, — гэта ж трэба — выпусціць з рук такога хлопца! Адно слова — мінчанка. Мабыць, даўно прызвычаілася да таго, што ў горадзе можна «перабіраць». Не тое, што ў вёсцы».

Але яна, Марына, сваё шчасце дакладна не выпусціць з рук. І нічога, што ў кватэры разам з Алесем жыве яго маці. «Старая ж, колькі там ёй гадоў ужо засталося», — думала Марына.

Не, яна не жадала дрэннага свекрыві, проста факт таго, што ў перспектыве ім застаецца цудоўная кватэра ў цэнтры сталіцы, саграваў яе сэрца.

Заставалася толькі «прывязаць» мужа дзецьмі. І тут, разважала яна, аднаго дзіцяці будзе мала. Неабходна двух-трох нарадзіць. Да таго ж яна заўсёды марыла пра вялікую сям'ю — як у бацькоў. (У Марыны было два браты і сястра. Калі ўся сям'я збіралася разам у бацькоўскай хаце, дзяўчына заўсёды адчувала сябе шчаслівай.)

Алеся яна пакахала адразу. Калі ён прыязджаў на лецішча ў іх вёску са сталіцы, то здаваўся ёй прынцам. Такога проста немагчыма было не пакахаць!..

Лецішча яму дасталася ад дзеда. Алесева першая жонка працаваць на зямлі не любіла, таму і не ездзіла разам з ім, нават калі яны яшчэ жылі разам. І Марына з лёгкасцю прыцягнула яго ўвагу да сябе.

Ды і чаму было ў яе не закахацца?.. Прырода Марыну знешнасцю не пакрыўдзіла. Вясковыя хлопцы заглядаліся на дзяўчыну яшчэ з падлеткавага ўзросту. Але ў якасці жаніхоў яна іх не разглядала. Не таму, што не любіла сваю вёску і зямлю — проста хацелася чагосьці іншага. Новых уражанняў, магчымасцяў і перспектыў. І крышачку казкі. А гэта можна было атрымаць толькі ў сталіцы.

І вось Марына, нарэшце, стала мінчанкай... Зацяжарала яна амаль адразу. Першай нарадзілася дачушка, потым адзін за адным два сыны. Паралельна Марына вучылася, бо паступіла ў педагагічны.

Гады ляцелі. Дзеці раслі. Марына выкладала ў школе. Алесь працаваў у фірме па ўстаноўцы шклопакетаў. У сям'і ўсё было добра, пакуль не памерла свякроў. І тады высветлілася, што на прыватызаваную кватэру, акрамя мужа, прэтэндуе яго старэйшы брат — ад першага матчынага шлюбу.

У выніку мінскай кватэрай Алесю і Марыне прыйшлося падзяліцца з сям'ёй Канстанціна, у якой, дарэчы, гадавалася двое дзяцей. І цяпер «трохпакаёўку» Марына называе інтэрнатам.

Алесь і Канстанцін дамовіліся, што першы застанецца ў матчынай кватэры, але выплаціць другому грошы за яе частку. У сваю чаргу, Канстанцін збіраецца будаваць асобнае жыллё. Але пакуль ні ў адной, ні ў другой сям'і не назбіралася патрэбнай сумы: у Алеся — каб выплаціць брату доўг, у Канстанціна — на першы ўзнос, каб банк выдаў крэдыт на будаўніцтва...

**Не, яна не жадала дрэннага свекрыві, проста факт таго, што ў перспектыве ім застаецца цудоўная кватэра ў цэнтры сталіцы, саграваў яе сэрца.**

## Бывай, сталіца?

Святлана пазнаёмілася з Віталем падчас вучобы на гістарычным факультэце БДУ. Спачатку яны проста сябравалі: сядзелі побач на лекцыях, разам рыхталіся да экзаменаў... А аднойчы, нечакана для абаіх, пацалаваліся. Пачаўся раман, які скончыўся вяселлем на чацвёртым курсе. Абараняла дыплом і здавала дзяржэкзамен Святлана ўжо цяжарнай.

Жыла маладая сям'я ў двухпакаёвай мінскай кватэры бацькоў Віталя (ён быў адзіным сынам). Адносіны са свекрывёю ў нявесткі адразу не склаліся. Зінаіда Антонаўна — так звалі маці Віталя — выбарам сына была не задаволена. Агульным знаёмым сям'і пастаянна скардзілася: маўляў, столькі дзяўчат у Мінску, а Віталік узяў «правінцыяльную галоту!». З татам і маці Святланы свякроў не жадала бачыцца прынцыпова: маўляў, няма ў яе такіх сваякоў, і «пакуль яна будзе жыць на гэтым свеце — не з'явіцца».

Зразумела, Святлане таксама пастаянна даставалася ад свекрыві: то не прыбрала ў кватэры, то дрэнна прыгатавала, то дзіця не дагледзела, то не так адпрасавала кашулі, то доўга размаўляла па тэлефоне ці глядзела тэлевізар...

Святлана прыдзіркі цярпела і спадзявалася на падтрымку мужа. Аднак яе не атрымлівала. Віталь выслухоўваў, суцяшаў, але супраць маці не ішоў.

А калі іх дачка крыху падрасла, Святлана не вытрымала. Апошняй кропляй сталі папрокі ў тым, што яна... спакушае свёкра.

Святлана сабрала рэчы і вярнулася да бацькоў у вёску. Нават хацела скасаваць шлюб, але Віталь пачаў угаворваць гэтага не рабіць. Зараз ён працуе на дзвюх работах, каб назбіраць грошай і купіць асобную кватэру, бо Святлана згодна вярнуцца да яго толькі на гэтых умовах...

Дзяўчатам, якія мараць аб сталічных прынцах і ўдалым шлюбе, тыя, хто там пабываў, раяць не забываць, што ў такім выбары ёсць не толькі свае «плюсы», але і «мінусы».

***Сярод несумненных «плюсаў»:***

— мінская прапіска;

— жыццё ў буйным горадзе;

— больш магчымасцяў для працаўладкавання;

— розныя варыянты адпачынку;

— лепшая інфраструктура;

— лепшы ўзровень сэрвісу;

— можна наведваць разнастайныя курсы, заняткі;

— новыя сябры і знаёмыя;

— калі асабістае жыццё не складваецца — лягчэй знайсці новага спадарожніка.

***Сярод «мінусаў»:***

— цяжка жыць з некаханым чалавекам, калі выходзіш замуж па разліку;

— бацькі мужа (ці жонкі) вельмі неахвотна прапісваюць «новых сваякоў» на сваю жылплошчу ці наогул не імкнуцца гэтага рабіць;

— калі ў бацькоў «другой палавіны» жыць немагчыма, то давядзецца здымаць жыллё, а яно ў сталіцы вельмі дарагое;

— цяжка пабудаваць ці купіць асабістае жыллё;

— складана адразу знайсці працу з такім заробкам, каб хапіла на здымнае жыллё;

— псіхалагічнае напружванне і стрэсы — спадарожнікі жыхароў буйных гарадоў;

— вельмі насычаны рытм жыцця ў параўнанні з вёскай, раённым і нават абласным цэнтрам;

— харчаванне і адзенне абыходзіцца даражэй, чым у невялікім горадзе;

— наяўнасць у многіх установах і арганізацыях дрэс-коду ў адзенні, што вымушае траціць на яго набыццё значна больш сродкаў, чым у іншых рэгіёнах рэспублікі;

— моцная канкурэнцыя ў прафесійнай сферы;

— дэфіцыт месцаў у садках.

Так што (на мой погляд) выходзьце, дзяўчаты, замуж па каханні. Яно, сапраўднае, дапаможа пераадолець усе цяжкасці і пабудаваць (разам і сваімі рукамі) тую казку, пра якую вы марылі ў дзяцінстве... Хоць у Мінску, хоць у любой іншай кропцы зямнога шара...

**Гелена АВЕЛА**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Мінус на плюс

# МУЖЧЫНЫ... НАВОШТА ЯНЫ НАМ?

**У жыцці кожнай жанчыны здараюцца моманты, калі яна шчыра пытаецца ў сябе: навошта патрэбны мужчыны? І насамрэч, пры вялікім жаданні і ўзроўні сучаснай тэхнікі можна цалкам абысціся без мужчын у любой сферы, няхай гэта будзе палітыка, вытворчасць ці будаўніцтва, не кажучы ўжо пра хатнюю гаспадарку і выхаванне дзяцей. Гэта пацвярджаецца нават статыстыкай: сёння колькасць незамужніх жанчын, якія паспяхова прасоўваюцца па кар'ернай лесвіцы і адначасова паспяваюць гадаваць дзяцей, значна павялічылася. Стоп! Але ж нейкім чынам дзеці з'явіліся на свет? Значыць, усё ж ёсць хоць адна прычына, якая апраўдвае існаванне на свеце гэтых прадстаўнікоў роду чалавечага! Прыходзіцца прызнаць, што ёсць. Хоць некаторыя дасведчаныя дамы могуць запярэчыць, што навука ўжо ўшчыльную падышла да магчымасці стварэння штучнага сперматазоіда, і ў бліжэйшай будучыні патрэба ў мужчынах і зусім адпадзе.**

На шчасце, рэдка хто з нас, жанчын, думае так катэгарычна. А калі і здараюцца прыступы раздражнення, злосці і неверагоднага жадання сабраць усіх мужыкоў у кучу і выгрузіць пасярэдзіне Бермудскага трохвугольніка, то тыя ж самыя мужыкі сваім клопатам і ўвагай прымушаюць нас адумацца. А вось калі такія думкі наведваюць вас ужо не першы раз, значыць, нешта не так не толькі з мужчынамі вакол вас, але і з вамі. З прыродай не паспрачаешся: яна граматна размеркавала ролі самак і самцоў у справе працягу роду. І нават калі вы ўпэўнены, што з усімі іншымі задачамі, акрамя сумеснага зачацця, цудоўна справіцеся самі, то навучыцеся хаця б выкарыстоўваць мужчын для ўласнай выгады. У гэтай справе вельмі дапамагае гумар.

Вазьміце чысты аркуш паперы, падзяліце яго ўздоўж на дзве паловы і, як гэта часта раяць псіхолагі, злева пішыце, ад якіх якасцяў у вашым мужчыне вас скаланае, а справа — як гэтыя ж яго нязносныя звычкі накіраваць сабе на карысць. Напрыклад:

✓ Раскідвае па ўсёй кватэры свае шкарпэткі, інструменты і да т.п.? Цудоўна! У вас будзе лішняя прычына для фізічнай актыўнасці — хада, прысяданні і нахілы падчас «збору ўраджаю», а значыць, большая верагоднасць захаваць стройную фігуру.

✓ Забываецца пра дзень нараджэння і гадавіну вяселля? Яшчэ лепш! Будзе падстава згуляць на пачуцці віны і атрымаць больш «важкі» падарунак.

✓ Шмат есць? Затое носіць цяжкія сумкі і сам ідзе па хлеб, калі на вуліцы лівень. А яшчэ не дае вам магчымасці даядаць за дзецьмі і тым самым набіраць лішнюю вагу.

✓ Ляжыць з часопісам на канапе, калі дзеці заганяюць ката на шафу? Правільна робіць: дзеці павінны вучыцца свабодна праяўляць свае эмоцыі (з намі, жанчынамі, ім гэта не ўдасца).

✓ Пастаянна цягне ў дом усякія жалязякі? А хто сабраў з іх пральную машынку?

✓ Часам паводзіць сябе, як дзіця? Затое вам не прыходзіцца траціць увесь выхадны дзень на зборку мадэлі дзіцячага канструктара з 10 тысяч дэталяў. А пакуль тата і сын захоплены такой важнай справай, можна і ў салон прыгажосці схадзіць, і з сяброўкай паразмаўляць.

✓ І ўспомніце, нарэшце, вядомы жарт: «Ну, хто яшчэ будзе лічыць мяне самай прыгожай і есці тое, што я гатую?».

І так ва ўсім. Вось убачыце, вы адразу пачняце разумець: без мужчын жыццё было б прэсным і сумным.

А колькі сапраўды важных рэчаў робяць для нас нашы мужчыны! Яны саграваюць пасцель, паркуюць аўтамабіль, зашпіляюць маланкі на спіне, могуць дастаць кніжку з верхняй паліцы, адкрываюць бляшанкі, чытаюць і разумеюць інструкцыі па эксплуатацыі бытавой тэхнікі, умеюць інсталяваць Windows, рашаюць з сынам задачкі і г. д. і да т. п.

Карацей, выснова: мужчына, без якога можна і абысціся, нам не патрэбен. А вось такі, без якога абысціся немагчыма, — патрэбен абавязкова! А паколькі жанчына сёння — асоба самастойная і рашучая, то ёй не цяжка будзе адрозніць аднаго ад другога.

**Марына КУЛІНКОВІЧ**

■ Што ў люстэрку

# Вашым вуснам патрэбна дапамога

**Вусны ўвесь час у працы: мы ядзім, гаворым, усміхаемся, цалуемся і да т.п. Плюс яны ўвесь час «навідавоку» — мы падстаўляем вусны ветру, сонцу, дажджу і пылу. Менавіта па гэтых прычынах іх паўнавартасны догляд вельмі важны. Да таго ж выразныя жаночыя вусны выглядаюць надзвычай сексуальна і гэтым прыцягваюць увагу мужчын.**

## КОЖНЫ ДЗЕНЬ

**Ачышчэнне** — першы пункт праграмы догляду любой часткі твару. Вусны трэба штодзённа ачышчаць ад касметыкі і ўсяго таго, што на іх магло патрапіць. Для гэтага спатрэбіцца ватны дыск і любы ачышчальны сродак (касметычнае малачко, ласьён, алей або вадкі крэм). Правядзіце па вуснах ватным дыскам, змочаным у сродку. Старайцеся пры гэтым вусны моцна не расцягваць (з-за гэтага з'яўляюцца маршчыны).

Для зняцця стойкай губной памады абавязкова выкарыстоўвайце спецыяльныя сродкі. Не ўздумайце змываць яе вадой альбо, яшчэ горш, вадой з мылам! Гэта моцна высушыць вусны і звядзе на нішто ўвесь ваш ранейшы догляд.

Другі этап — **увільгатненне і сілкаванне**. Звычайна крэмы для вуснаў і для павекаў даражэйшыя за любыя іншыя сродкі догляду, таму што гэтым участкам патрэбен асаблівы догляд. Лепшыя хатнія сродкі — натуральныя алеі. Напрыклад, аліўкавы ці алей вінаграднай костачкі (можна купіць у аптэцы). Імі можна карыстацца (па адчуваннях) на працягу дня замест гігіенічнай памады. Апошняя, дарэчы, павінна быць заўсёды пад рукой. Лепш купіць адразу некалькі цюбікаў: каб адзін быў у кішэні паліто, другі — дома, трэці — на працы. І карыстайцеся па неабходнасці. (Дарэчы, перш чым нанесці каляровую памаду, змажце вусны ўвільгатняльным бальзамам. Памятайце, што матавыя памады моцна сушаць вусны, таму выкарыстоўваць іх кожны дзень не рэкамендуецца.)

Два літры вады, вітаміны А і Е, агародніна і садавіна — усё гэта павінна быць у штодзённым рацыёне прыгажосці. Асабліва востра вусны «рэагуюць» на недахоп вады. Памятайце: сокі, гарбата і кава ў гэтыя два літры не ўваходзяць!

## РАЗ НА ТЫДЗЕНЬ

Як і твар, вусны маюць патрэбу **ў ачышчэнні скуры ад амярцвелых клетак**. Самы просты спосаб — раз на тыдзень масіраваць іх вільготнай зубной шчоткай або махровым ручніком. Толькі не забывайце, што тонкую скуру лепш лішні раз не расцягваць, а таму рухі павінны быць плаўнымі.

У салонах для гэтай працэдуры выкарыстоўваюць мяккія фруктовыя кіслоты. Дома можна прыгатаваць скраб з молатых аўсяных шматкоў і мёду. Пасля нанясіце на вусны маску, зробленую, да прыкладу, з тварагу і вяршкоў або смятаны, аліўкавага алею і лімоннага соку.

Догляд вуснаў будзе не поўным без іх масажу. Гэта можа здацца дзіўным, але вуснам патрэбен масаж. Памятаеце, у фільмах пра старадаўнія часы красуні перад выхадам да добрых малайцоў старанна шчыпалі сябе за шчокі і вусны? У выніку на шчоках з'яўляўся румянец, вусны пунсавелі. А ўсё таму, што яны ведалі: добрае кровазабеспячэнне скуры вуснаў — гэта важна. Менавіта таму трэба часам масіраваць вусны падушачкамі пальцаў. Вельмі важна пасля масажу завяршыць догляд вуснаў правільна: абавязкова нанесці на іх тлусты крэм.

## SOS: ВУСНЫ Ў НЕБЯСПЕЦЫ

Герпес і заеды — дзве самыя прыкрыя непрыемнасці, якія могуць здарыцца з нашымі вуснамі.

**Герпес** — гэта вірус. Інфіцыраваны ім да 95% жыхароў Зямлі. Праяўляецца ён непрыемнымі язвачкамі: спачатку з'яўляецца пухірок, які потым ператвараецца ў несімпатычную скарыначку. Звычайна на тым месцы, дзе «выскачыць» герпес, адчуваецца смыленне, сверб; агульнае самаадчуванне пры гэтым пагаршаецца.

Пры герпесе нельга цалавацца, карыстацца дэкаратыўнай памадай, не варта церці вочы (каб не занесці вірус на слізістую) — карацей, ніякага задавальнення. Калі герпес «выскачыў», давядзецца пакорліва чакаць, калі ён падсохне і «адпадзе». Паскорыць працэс выздараўлення можна наступным чынам: па-першае, своечасова прыняўшы супрацьвірусны прэпарат (папрасіце свайго ўрача парэкамендаваць дзейсны сродак, асабліва калі вы хварэеце часта); па-другое, выкарыстоўваючы антыгерпесныя мазі і наклейкі — яны змяшчаюць рэчывы, якія дапамагаюць загойванню ранкі, а таксама закрываюць пухір ад вільгаці, што таксама дапамагае хутчэй пазбавіцца ад немачы.

Калі герпес з'яўляецца ў вас рэгулярна або доўга не гоіцца, абавязкова звярніцеся да доктара — гэта можа быць сімптомам іншых захворванняў.

**Заеда** — гэта трэшчынкі ў куточках рота, якія могуць кроватачыць і запаляцца. Пры гэтым балюча есці, размаўляць і нават смяяцца. А пра непрэзентабельны выгляд і гаварыць няма чаго.

Заеда можа ўзнікнуць па самых розных прычынах: напрыклад, з-за авітамінозу (асабліва недахопу вітаміну $B_2$), няправільнага прыкусу, праблем з кішэчнікам, дрэнна падабраных зубных пратэзаў, звычкі аблізваць і кусаць вусны, няякаснай губной памады і інш.

З чаго пачынаць барацьбу? Залячыць карыёзныя зубы, ліквідаваць раздражняльныя фактары (зубны камень, няякасныя каронкі або пратэзы). Калі вы курыце, паспрабуйце кінуць або хаця б абмяжуйце колькасць выкураных за дзень цыгарэт.

Не варта лячыцца самастойна. Лекавыя прэпараты вам падбярэ ўрач з улікам асаблівасцяў захворвання, індывідуальнай адчувальнасці да лекаў.

Пры ўпартым цячэнні захворвання звычайна праводзяць лабараторны саскроб для выяўлення ўзбуджальніка (гэта могуць быць стрэптакокі, стафілакокі або дрожджападобныя грыбы роду Candida); аналіз крыві на наяўнасць вітаміну $B_2$.

Аблегчыць стан дапамогуць прымочкі на вусны з настою дубовай кары або альховых шышак, якія валодаюць дэзынфікуючымі, вяжучымі ўласцівасцямі.

Унутр прызначаюць вітамінныя прэпараты (вітамін А ў алейным растворы, вітаміны С і комплексу В), сіроп шыпшыны, медыцынскія піўныя дрожджы.

Пастарайцеся ўзбагаціць рацыён агароднінай, садавіной, выключыце вострае, кіслае, салёнае. Больш ужывайце малочных прадуктаў. Аддавайце перавагу адварному мясу. Пры грыбковай інфекцыі абмяжуйце ласункі.

Каб заеда не з'явілася зноў, строга выконвайце гігіенічныя патрабаванні пры доглядзе поласці рота і сачыце, каб ручнік для твару заўсёды быў чыстым.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ**

■ Матуліны занатоўкі

# НАВУКА ДЫПЛАМАТЫІ




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**«Калісьці я была найлепшай у свеце маці. А потым нарадзіла ўласнае дзіця...» Аўтара гэтага прызнання я не памятаю, але больш трапна, напэўна, не скажаш. Цяпер я не крытыкую чужыя спосабы выхавання, не абмяркоўваю паводзіны іншых дзяцей, ні ў чым больш не папракаю сваіх бацькоў і шмат чаго яшчэ «не». Ва ўсіх свой шлях. А яшчэ так працей захоўваць унутраную раўнавагу і не мітусіцца там, дзе яно не трэба.**

Ну не жадае мае малое есці самастойна. І нават шкарпэткі толкам здымаць не навучылася. Ага, і пірамідку ніколі не збірала. Засынаць самастойна дык наогул, здаецца, ніколі не збіраецца... Але пакуль нам абаім гэта надта не перашкаджае, аддаваць усе сілы на выпраўленне падобных «хібаў» я не буду. Хопіць з мяне адной пірамідкі.

Сапраўды, быў час, калі я разглядала розныя табліцы накшталт «колькі важыць і што ўмее ваша дзіця ў 6, 12, 18 месяцаў» як кіраўніцтва да дзеяння. І нішто не прыводзіла мяне ў такі адчай, як тая славутая пірамідка. Як ні спрабавала я зацікавіць ёй свайго Антона (бо практычна ўсюды сцвярджалася, што ў пэўным узросце гэтая немудрагелістая штуковіна проста абавязана стаць улюбёнай цацкай любога нармальнага малога), ён нават глядзець у яе бок не жадаў. Я тэлефанавала сяброўкам, пыталася: «А што ў цябе? Як твой? Збіраў пірамідку?» Збіраў, аказваецца. Усе збіралі. Акрамя майго Антона... Ён ужо чытаць навучыўся, а пірамідка ўсе стаяла навідавоку, казытаючы маё сумленне. Нагадваючы, што развіваю я сваё дзіця абы-як — ды ніяк не развіваю, можна сказаць! Нездарма кажуць: ніводны занятак не абцяжараны такім пачуццём віны, як бацькоўства... На шчасце, праз колькі месяцаў «егіпецкіх» пакут мне трапілася кніжка, дзе апісваліся розныя тыпы дзяцей у залежнасці ад таго, якая частка мозга ад нараджэння з'яўляецца ў іх вядучай. Вось там — напэўна, спецыяльна для мяне — і паведамлялася, што такія, як мой Антошка, ні пірамідкамі, ні пазламі, ні канструктарамі звычайна не цікавяцца. Той кніжцы я паверыла адразу. Не таму, што дагэтуль верыла ўсім кніжкам пра дзіцячае выхаванне. Проста стамілася я ад гэтай пірамідкі не на жарт...

Урэшце, вунь у Швецыі (летась мы там гасцілі ў сяброў) шасцігадовае дзіця ў памперсах нікога не шакіруе. Праўда, такое сустракаецца нячаста. Але памперсы на чатырохгадовых — справа самая звычайная... Не так даўно шведская прэса абмяркоўвала дзяўчынку, якая ў 10 гадоў пайшла «першы раз у першы клас». Проста таму, што раней не пажадала. Правы (і, здаецца, жаданні) дзяцей у гэтай краіне ахоўваюцца свята... Як бы дзіўна ні выглядала там штосьці з нашага пункту гледжання, а шведы ж на самой справе — адна з самых спакойных, ураўнаважаных і некрымінагенных нацый.

Усё, будзем жыць «як у Швецыі», вырашыла я. Галоўным будзе Антон. А я... буду проста разумнай.

Упарта жадае пайсці гуляць пад снегам без каптурка ці ў ваўняных пальчатках падчас летняй спякоты? Калі ласка. Насуперак усім тлумачэнням хоча «пагладзіць» агонь ці з лямантам патрабуе бацькаву брытву? Добра, няхай... Паспрабаваўшы ўсё гэта адзін раз, мой сын мала што перастаў вяртацца да падобных эксперыментаў, але і пачаў больш уважліва прыслухоўвацца да маіх слоў. Зрэшты, дамовіцца мне з ім удавалася (і ўдаецца дагэтуль) амаль заўсёды. Хаця памятаю, як сваяк, да якога мы неяк завіталі ў госці, з рогатам запрашаў усіх сваіх паглядзець «цырк», маючы на ўвазе нашы з Антонам «дыпламатычныя перамовы» з-за неабходнасці ісці гуляць у боціках. Маўляў, які сэнс так вошкацца з малым, калі ён яшчэ нічога не разумее? Да нараджэння сына я таксама лічыла, што маленькае дзіця — не зусім паўнавартасны чалавек. Але Антон вельмі рана прымусіў мяне зразумець, што ад дарослага ён адрозніваецца толькі меншым жыццёвым вопытам. А набыўшы гэты вопыт, цалкам здольны да дарослых паводзін.

Скажам, у краме ён заўжды дапамагае мне раскладваць пакупкі перад прадаўцом. І аднойчы (мы толькі адсвяткавалі першы Антонаў дзень нараджэння) мне не хапіла грошай на ўсё, што было выбрана. Я дазволіла сыну самому вырашыць, ад чаго мы адмовімся... З таго часу сакраментальная фраза «У нас зараз мала грошай», якую бацькі звычайна згадваюць у адказ на патрабаванні малога купіць нейкую цацку, спрацоўвае ў нас бездакорна. Бо, што гэта азначае, Антон добра ведае і па-даросламу згаджаецца са мною.

Толькі аднойчы ён пакрыўдзіў чужога хлопчыка, забраўшы ў яго цацку. Той, натуральна, пачаў раўці. Я прапанавала сыну «ператварыцца ў чараўніка» і даць хлопчыку «адступнога» ў выглядзе Антошкавай улюбёнай цацкі. Не адразу, але на эксперымент ён згадзіўся. І быў настолькі ўражаны, што ў яго сілах выклікаць у кагосьці не толькі слёзы, але і ўсмешку, таму канфліктаў на дзіцячай пляцоўцы ў нас не ўзнікала больш ніколі.

Ну і шмат чаго яшчэ... Натуральна, я раблю ўсё тое ж, што і іншыя бацькі. Але кожным разам уяўляю сябе, дарослую, на сынавым месцы і са свайго, дарослага пункту гледжання спрабую растлумачыць сітуацыю так, каб не пакрыўдзіць сваю малечу. Я вельмі яго паважаю і захапляюся яго здольнасцю вучыцца ўсяму фактычна без настаўнікаў (а заадно — усімі іншымі малымі, варта ім толькі давяраць!). Усё, што тычыцца сынавага жыцця, я дазваляю вырашаць яму самому (хаця на ўсялякі выпадак — каб падстрахаваць ці залячыць гузакі — далёка не адыходжу). Дарэчы, у памперсах ён у мяне даўно не ходзіць: сам ад іх адмовіўся, усяго толькі пару дзён паназіраўшы, як яго цацкі «карыстаюцца» гаршком...

У выніку за ўсе два з «хвосцікам» гады Антонавага жыцця я наўрад ці налічу ў агульнай колькасці хаця б пару гадзін яго слёз. У яго проста няма прычын плакаць. Пры тым, што дзіця ў мяне надзвычай актыўнае і ўражлівае. Проста я ўмею з ім дамаўляцца. Без крыкаў і гвалту... Дарэчы, а вы ўжо бачылі навіну, што брытанскі парламент хоча забараніць бацькам біць сваіх дзяцей? Бо іх навукоўцы высветлілі, што дзеці, на якіх у раннім узросце падымаюць руку, пазней заўважна ўступаюць сваім равеснікам у інтэлекце...

**Марына БЕРАЗЕНСКАЯ**

**Считать недействительными страховые полисы ИСП «ЦЕПТЕР ИНШУРАНС»**

по добровольному страхованию от заболеваний и травм выезжающих за рубеж формы 2РН, 2РП серии МТ/2401/005199, МТ/2401/024170, МТ/2401/027005, МТ/2401/027518, МТ/2401/027989, МТ/2401/027992, МТ/2401/027995, МТ/2401/027998, МТ/2401/028021, МТ/2401/028025, МТ/2401/028068, МТ/2401/028575, МТ/2401/028576, МТ/028577, МТ/2401/028579, МТ/2401/029345, МТ/2401/029346, МТ/2401/029367, МТ/2401/029564, МТ/2401/029635, МТ/2401/029703, МТ/2401/029705, МТ/2401/031383, МТ/2401/031384, МТ/2401/031394, МТ/2401/031395, МТ/2401/032090, МТ/2401/032127, МТ/2401/032179, МТ/2401/032258, МТ/2401/032271, МТ/2401/032300, МТ/2401/033831, МТ/2401/033832, МТ/2401/033854, МТ/2401/034335, МТ/2401/034495, МТ/2401/034497, МТ/2401/034500, МТ/2401/035669, МТ/2401/039811, МТ/2401/039812, МТ/2401/040164, МТ/2401/040174, МТ/2401/041350.

В суд Речицкого района Гомельской области поступило заявление о признании безвестно отсутствующим **БУСЛОВА Александра Николаевича,** 20 марта 1972 года рождения, уроженца г. Гомеля, проживавшего по последнему известному адресу: Гомельская область, Речицкий район, д. Бабичи, ул. Мастрюкова, д. 46.

**Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам сообщить в суд Речицкого района в течение 2-х месяцев со дня публикации имеющиеся сведения о БУСЛОВЕ Александре Николаевиче.**

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

### по продаже земельных участков для индивидуального жилищного строительства.

**Продавец – Раковский сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области**

| Лот | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей | Затраты на подготовку участка к аукциону (без учета объявления) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок в агрогородке Раков, переулок Пионерский, 6 площадью 0,1000 гектара | Кадастровый номер участка 622085715608000016. Целевое назначение земельного участка – строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Подъездные пути, электричество, природный газ | 50 000 000 | 5 000 000 | 7 496 200 |
| 2 | Земельный участок в деревне Лесковка, уч. 26 площадью 0,1500 гектара | Кадастровый номер участка 622085709601000029. Целевое назначение земельного участка – строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Имеются хороший подъезд к участку, электричество. Участок расположен среди лесного массива. Удалённость от аг. Раков 8 километров. | 20 000 000 | 2 000 000 | 4 172 800 |
| 3 | Земельный участок в деревне Бузуны, уч. 100 площадью 0,1100 гектара | Кадастровый номер участка 622085702101000276. Целевое назначение земельного участка – строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Есть асфальтированный подъезд. Удалённость от аг. Раков 5 километров. | 20 000 000 | 2 000 000 | 4 762 400 |
| 4 | Земельный участок в деревне Мацевичи площадью 0,1500 гектара | Кадастровый номер участка 622085710601000025. Целевое назначение земельного участка – строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Удалённость от аг. Раков 8 километров. | 20 000 000 | 2 000 000 | 5 020 100 |
| 5 | Земельный участок в деревне Турковщина, ул. Садовая, 12 площадью 0,1450 гектара | Кадастровый номер участка 622085719101000102. Целевое назначение земельного участка – строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Удалённость от аг. Раков 18 километров, до станции Радошковичи Молодечненской железной дороги – 5 километров. | 20 000 000 | 2 000 000 | 5 110 300 |

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории Республики Беларусь или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется квитанцией на расчётный счёт госказначейства № 3600614140501 Главное управление МФ РБ по Минской области в ЦБУ № 605, г. Воложин, филиал № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 153001601, УНП 600537220. Код платежа 04901.

**Аукцион состоится 24 декабря 2013 года (вторник) в 10.00 по адресу:** агрогородок Раков, площадь Свободы, д. 11, 2-ой этаж, зал заседаний. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются до 20 декабря 2013 года (включительно) до 17.00 по адресу: аг. Раков, пл. Свободы, д. 11, кабинет управляющего делами исполкома.

Оплата по результатам аукциона должна быть произведена в десятидневный срок со дня подписания протокола.

**Контактные телефоны: (8 01772) 30 305; 8029 1405437.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

### с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Бресте

| Предмет аукциона | Право на заключение договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений) на земельном участке | |
|---|---|---|
| | **лот №1** | **лот №2*** |
| | ул. Карьерная площадью 3,2300 га | ул. Менжинского, 22 площадью 0,0593 га |
| **Функциональное назначение земельного участка** | строительство объекта многофункционального назначения | строительство и обслуживание объекта административно-офисного назначения |
| **Срок аренды земельного участка** | **5 лет** | **5 лет** |
| **Объекты недвижимости, подлежащие сносу** | незавершенные строительством объекты КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» по ул. Карьерной | здание и сооружения КУП «ЖРЭУ г. Бреста» по ул. Менжинского, 22; *гараж, находящийся в собственности физического лица* |
| Снос объектов недвижимости производится в установленном законодательством порядке. Объекты расположены в районах с развитой инженерной инфраструктурой | | |
| **Начальная цена продажи (руб.)** | 1 608 007 050 | 55 166 648 |
| **Сумма задатка (руб.)** | 321 600 000 | 11 000 000 |
| **Расходы по подготовке земельно-кадастровой документации, тех. условий, АПЗ (руб.)** | **11 896 999** | **6 922 758** |
| **Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельных участков и сносом расположенных на них объектов недвижимости, возмещаемый победителем аукциона землепользователям, (руб.)** | **1 033 572 594** *(на 02.10.2013 г.)* | **227 221 000** *(на 10.06.2013 г.)* |
| ***- повторные аукционные торги** | | |

**Условия продажи:**

Земельный участок будет предоставляться победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выразившему согласие на предоставление ему предмета аукциона в аренду сроком на 5 лет для строительства и обслуживания объекта, на основании решения Брестского горисполкома об изъятии и предоставлении земельного участка в аренду, при соблюдении следующих условий:

- в день проведения аукциона будет подписан акт выбора места размещения земельного участка;
- в установленном порядке будет заключен с проектной организацией договор на разработку проектной документации на строительство объекта (с выделением при необходимости отдельных этапов) с учетом ее государственной экспертизы в срок, не превышающий двух лет, со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка;
- в срок, не превышающий одного года со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка, будет предоставлен в ДУП «Проектный институт Брестгипрозем» генеральный план объекта строительства с проектируемыми инженерными сетями, разработанный в составе проектной документации – архитектурного проекта или утверждаемой части строительного проекта, с учетом прохождения в установленном порядке согласования в управлении архитектуры и градостроительства Брестского горисполкома, и заключен договор подряда на разработку проекта отвода земельного участка под объект строительства;
- в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения об изъятии и предоставлении земельного участка в аренду на р/с городского бюджета будут внесены суммы платежей, отраженных в протоколе о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размерах, определенных соответствующим протоколом аукционных торгов в счет оплаты за предмет аукциона (победителем аукциона – в размере цены продажи, сформированной по результатам аукциона, а единственным участником – в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов) и компенсации расходов, понесенных городским бюджетом, по подготовке земельно–кадастровой документации, архитектурно–планировочного задания и технических условий на размещение объекта;
- до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, подписания договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), а также договора аренды земельного участка будут выполнены условия, предусмотренные в решении об изъятии и предоставлении земельного участка в аренду.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан приступить к освоению (занятию) земельного участка в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство объекта);

**Дополнительно по лоту №1 –** осуществить обустройство прилегающей дворовой территории со сносом сарая и строительством парковочной стоянки (в случае необходимости в два уровня).

Организатор торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукциона с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462, и состоится при наличии не менее двух участников.** В аукционе могут участвовать юридические лица и индивидуальные предприниматели.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем –** копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; **иностранным юридическим лицом –** копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно–финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык**; представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) –** доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Порядок осмотра предмета аукциона (лота) осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права, обязанности и ответственность сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

**Задаток в размере до 20% от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924.**

В случае признания участника победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона, выразившим согласие на предоставление ему предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, данное лицо обязано в течение 10 рабочих дней с даты проведения торгов возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

**Аукцион состоится 27 декабря 2013 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**

Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 25.11.2013 г. до 17.30 20.12.2013 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.

**Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65.**

Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www gki.gov.by.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

### по продаже земельных участков в г. Бресте в частную собственность граждан Республики Беларусь

